

СЕКС СУПРАЦЬ ДЭМЕНЦЫІ

Сямейная газета

АДКУЛЬ ПАХОДЗІЦЬ «ДЭКРЭТАФОБІЯ»?



Сямейная газета



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

20 ЛЮТАГА 2020 г. ЧАЦВЕР № 34 (29148)


## ЦЫТАТА ДНЯ



**Вольга ЧУПРЫС, намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта:**

*«Наша задача — наведаць усе рэгіёны і працаваць з усімі жыхарамі краіны. Часам, калі няма зваротаў, здаецца, што і праблем там няма, аднак пры асабістых сустрэчах высвятляюцца розныя сітуацыі. Вельмі важна камунікаваць з насельніцтвам, мы адкрытыя для ўсіх пытанняў. Практыка сустрэч з калектывамі, правядзення асабістых прыёмаў кіраўніцтвам Адміністрацыі Прэзідэнта будзе працягвацца».*

## КОРАТКА

- **Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка падпісаў указ, якім адкарэктаваны правілы фарміравання і дзейнасці будаўнічых атрадаў.**
- Кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Ігар Сергеенка азнаёміўся з дзейнасцю Беларускага інстытута стратэгічных даследаванняў.
- **У Беларусі 43,3 % уведзенага ў студзені жылля пабудавана для тых, хто мае патрэбу.**
- Імя прадстаўніка Беларусі на «Еўрабачанні-2020» стане вядома 28 лютага.
- **Аркестр Міхаіла Фінберга прэзентуе 22 лютага праграму, прысвечаную Гродна.**
- Беларусь не разглядае магчымасць забароны на ўезд замежнікаў, якія наведалі Кітай.
- **«Белнафтахім» працягвае перагаворы з Польшчай па арганізацыі рэверсных паставак нафты.**
- Мінскі планетарый запрашае паглядзець паўнакупальныя фільмы на беларускай мове.
- **У Мінскім заапарку пасяліўся чаротавы кот з Навасібірска.**


ISSN 1990 - 763X


З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

# «З КАІРА ПРАЦУЕМ ПРАКТЫЧНА НА ЎСЮ ПАЎНОЧНУЮ АФРЫКУ»

## Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка знаходзіцца з афіцыйным візітам у Егіпце

**Лідар Беларусі ў прэзідэнцкім палацы «Аль-Ітыхадыя» ў Каіры правёў перагаворы з Прэзідэнтам Егіпта Абдэль Фатахам ас-Сісі.**

Перагаворы прэзідэнтаў пачаліся з пратакольнай цырымоніі. Абдэль Фатах ас-Сісі сустрэў Аляксандра Лукашэнку каля ўваходу ў палац, і пасля выканання гімнаў і цырыманіялу з удзелам роты ганаровай варты прэзідэнты селі за стол перагавораў. Сустрэча пачалася ў фармаце «сам на сам», затым да кіраўнікоў дзяржаў далучыліся члены дэлегацый.

### КУРС НА ЎЗАЕМАЗБЛІЖЭННЕ

Егіпет плануе адкрыць сваё пасольства ў Мінску.

«Вітаем планы егіпецкага боку па адкрыцці дыпламатычнага прадстаўніцтва ў Беларусі. Мы акажам для гэтага ўсякую падтрымку як самай блізкай і добрай дзяржаве, з якой мы супрацоўнічаем», — сказаў на сустрэчы з журналістамі Аляксандр Лукашэнка.



Фота БелТА.

Паводле яго слоў, падыходы абедзвюх краін па асноўных пытаннях міжнароднага парадку супадаюць.

***«Мы выступаем за мірнае ўрэгуляванне рэгіянальных канфліктаў, супраць усіх відаў гібрыдных войнаў, а таксама штучнай дэстабілізацыі сітуацыі ў розных краінах»***, — заявіў Прэзідэнт.

Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што Беларусь асуджае любыя праявы тэрарызму і выказвае поўную падтрымку намаганням Егіпта ў барацьбе з гэтай пагрозай.

Па выніках перагавораў прэзідэнты Беларусі і Егіпта падпісалі пакет дакументаў. Сярод іх міжурадавая выканаўчая праграма аб супрацоўніцтве ў сферы вышэйшай адукацыі, пагадненне аб супрацоўніцтве і ўзаемнай дапамозе ў мытных справах.

Паміж міністэрствамі замежных спраў заключаны мемарандум аб узаемадзеянні. Ён прадугледжвае стварэнне сумеснай камісіі высокага ўзроўню па пытаннях двухбаковага супрацоўніцтва і палітычнага дыялогу паміж Беларуссю і Егіптам на ўзроўні міністраў замежных спраў.


СТАР. 2


Пытанне рубам

# На агранома — без экзаменаў?

## Якіх прэферэнцый чакаюць маладыя кадры АПК

**Згодна з апытаннем, якое правялі ў Гродзенскай вобласці, каля 9 % школьнікаў збіраюцца звязаць сваё жыццё з сельскай гаспадаркай. А калі б прымалі ў аграрны ўніверсітэт без экзаменаў, вучыцца пайшлі б 26 % апытаных. Астатніх палохаюць цяжкія ўмовы працы, нізкая зарплата, вясковае жыццё і наватнепрэстыжнасць прафесіі.**

**Як забяспечыць адну з самых важных сфер нашай эканомікі кадрамі? Аб гэтым разважалі ў фармаце «круглага стала» прадстаўнікі ўлады, навукоўцы і сельгасвытворцы. Сустрэча праходзіла з удзелам памочніка Прэзідэнта — інспектара па Гродзенскай вобласці Івана ЛАЎРЫНОВІЧА.**


СТАР. 4




Фота з сайта ГДАУ.

Праблема і рашэнні

# ГОМЕЛЬСКІЯ ВУЧОНЫЯ РАСШЫФРАВАЛІ ГЕНОМ ЖУКА-КАРАЕДА



Навуковы супрацоўнік Інстытута лесу Галіна ПОМАЗ рыхтуе матэрыялы для даследаванняў.

**Каля 80 тысяч гектараў хваёвых лясоў Беларусі за апошнія тры гады пацярпелі ад высыхання — іх пашкодзіў жук-караед. Асноўны ўдар прыпаў на Гомельскую вобласць. Цяпер у рэгіёне паказчык заражэння шкоднікам удалося знізіць у 2,5 разы. Спрагназаваць далейшыя ўспышкі росту папуляцыі караеда і выпрацаваць меры барацьбы з ім дапамагаюць супрацоўнікі Інстытута лесу НАН Беларусі. Тут упершыню расшыфравалі геном жука-караеда.**

У лабараторыі праблем аднаўлення, абароны і аховы лясоў **навуковы супрацоўнік Галіна ПОМАЗ** высыпае на прыборнае шкло пад бінакулярам з дзясятак незразумелых, на першы погляд, цёмных зярнятак. Пад павелічэннем лінзы вымалёўваюцца цэлы вяршыннага жука-караеда:

— Тры міліметры ўсяго ў даўжыню, — гаворыць Галіна. — Яны сонныя, лянівыя цяпер, бо былі ў халадзільнай камеры. Павялічым малюнак, і можна разгледзець покрыва з дробных шарсцінак на панцыры.

Цяжка ўявіць, што насякомае памерам з паўклеткі ў вучнёўскім сшытку, якое пад прыцэлам бінакуляра сонна перабірае лапкамі, жукзабойца хваёвых лясоў.

А цяпер невялікі «рум-тур» па летніх кватэрах. Так хочацца пажартаваць, калі гляджу на дзеянні навуковага супрацоўніка, які здымае тонкі пласт пад карой. Але цяпер не да жартаў: на кавалку сасновага ствала памерам ледзь больш за метр — сотні чорных кропак. Гэта як адкрытыя ўваходныя дзверы «кватаранта-забойцы».


СТАР. 13

# «З КАІРА ПРАЦУЕМ ПРАКТЫЧНА НА ЎСЮ ПАЎНОЧНУЮ АФРЫКУ»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Яшчэ адзін мемарандум аб узаемадзеянні быў падпісаны паміж Нацыянальным банкам Беларусі і Цэнтральным банкам Егіпта.

Як растлумачыў журналістам міністр замежных спраў нашай краіны Уладзімір Макей, раней беларускі бок даў Егіпту некалькі ўчасткаў на выбар для будаўніцтва пасольства.

«Пасля пэўнага перыяду зацішша яны актывізавалі працэс, і цяпер гэтыя ўчасткі на разглядзе. Мы чакаем адказу. Гатоўнасць да адкрыцця пасольства ёсць. Я думаю, гэта таксама паслужыць стымулам для паглыблення нашага ўзаемадзеяння», — лічыць міністр.

Таксама Прэзідэнт паведаміў, што Беларусь і Егіпет вырашылі рабіць стаўку на сумесныя прадпрыемствы.

«Беларусь і Егіпет з'яўляюцца важнымі партнёрамі. ***У нас вялікія перспектывы.*** За апошні час мы значна прасунуліся ў нашым супрацоўніцтве. Гэтаму спрыяе пастаянны дыялог паміж Мінскам і Каірам. У нас няма закрытых тэм, усе пытанні з Прэзідэнтам абмяркоўваем грунтоўна і адкрыта. Менавіта такія былі і сённяшнія перагаворы», — расказаў Аляксандр Лукашэнка.

### ПРАМЫСЛОВАЯ КААПЕРАЦЫЯ Ў ПРЫЯРЫТЭЦЕ

Асноўную ўвагу на перагаворах прэзідэнты звярнулі на гандлёва-эканамічныя сувязі. «Прыемна адзначыць, што дамоўленасці аб узаемадзеянні ў гэтай сферы ў цэлым выконваюцца: і беларускі, і егіпецкі бакі прыкладаюць для гэтага ўсе намаганні», — заявіў кіраўнік нашай дзяржавы.

Ён згадаў, што добрыя сумесныя напрацоўкі ёсць у прамысловай, ваенна-тэхнічнай, сельскагаспадарчай, навуковай, гуманітарнай галінах. У сферы прамысловай кааперацыі краіны пачыналі з праектаў па стварэнні ў Егіпце зборачных вытворчасцяў. Арганізавана зборка тэхнікі Мінскага аўтамабільнага і Мінскага трактарнага заводаў.

У найбліжэйшай перспектыве пачнецца выпуск прадукцыі «Бабруйскаграмаша», «Амкадора», рухавікоў Мінскага маторнага завода.

«Перакананы, што ***развіццё прамысловай кааперацыі цалкам адпавядае інтарэсам дзвюх дзяржаў і дазваляе забяспечыць выхад на рынкі суседніх афрыканскіх краін,*** што для нас вельмі важна. Дай бог асвоіць стамільённы рынак Егіпта. ***З Каіра разам працуем практычна на ўсю Паўночную Афрыку*** і разглядаем варыянты далейшага сумеснага прасоўвання па кантыненце», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

Патэнцыял беларускі бок бачыць у інавацыях і высокіх тэхналогіях, навуцы і адукацыі. ***«Таму мы робім стаўку на прасоўванне высокатэхналагічнай прадукцыі ў Егіпет з наступным стварэннем сумесных прадпрыемстваў.*** Такі падыход ужо паказаў сваю эфектыўнасць», — падкрэсліў Прэзідэнт.

Кіраўнік дзяржавы таксама лічыць перспектыўным супрацоўніцтва ў сферы бяспекі і інфармацыйных тэхналогій, у тым ліку ў стварэнні сучасных сістэм гарантавання грамадскай бяспекі. Беларусь гатовая пастаўляць у Егіпет найноўшае медыцынскае абсталяванне, а таксама харчаванне.

Акрамя таго, беларускі бок зацікаўлены ўзяць удзел у стварэнні асобай эканамічнай зоны Суэцкага канала.

***«Для Беларусі вялікую цікавасць уяўляе ўдзел у маштабных праектах, ініцыяваных егіпецкім кіраўніцтвам, перш за ўсё ў стварэнні асобай эканамічнай зоны Суэцкага канала, арыентаванай на экспарт»***, — сказаў журналістам Аляксандр Лукашэнка. Гэтаму пытанню бакі ўдзялілі асаблівую ўвагу падчас перагавораў.




Прэзідэнт выказаў упэўненасць, што першае пасяджэнне беларуска-егіпецкага Савета дзелавога супрацоўніцтва і сумесная выстаўка навуковых і прамысловых дасягненняў, якія праходзяць гэтымі днямі ў Каіры, нададуць дадатковы імпульс супрацоўніцтву паміж краінамі.

«Месцазнаходжанне Егіпта і Беларусі на міжнароднай карце дазволіць адкрыць новыя рынкі перад егіпецкай і беларускай прадукцыяй як у краінах Еўразійскага эканамічнага саюза, так і ў арабскім свеце і афрыканскіх краінах», — у сваю чаргу заявіў Абдэль Фатах ас-Сісі. Ён разлічвае, што гэтаму будуць спрыяць стварэнне зоны свабоднага гандлю ў Афрыцы і падпісанне ў будучыні пагаднення паміж Егіптам і ЕАЭС. У другой палове дня Аляксандр Лукашэнка правёў перагаворы са старшынёй Палаты прадстаўнікоў Егіпта Алі Абдэлем аль-Саедам.

* * *

Сёння ў Аляксандра Лукашэнкі запланаваны шэраг сустрэч і наведванне сумесна з Абдэль Фатахам ас-Сісі новай адміністрацыйнай сталіцы Егіпта, якая будуецца за 45 кіламетраў на ўсход ад Каіра.

**Паводле БелТА.**

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Сусветныя кампаніі вяртаюцца ў Кітай насуперак успышцы каранавіруса




Японскі аўтавытворца Toyota вярнуўся ў Кітай і аднавіў вытворчасць на адным са сваіх заводаў у гэтай краіне насуперак успышцы смяротнага каранавіруса COVID-2019, паведаміла японскае агенцтва Kyodo. Гэта ўжо другая сусветная кампанія, якая прыняла такое рашэнне. Па звестках выдання, работы на заводзе ў горадзе Цяньцзінь пачаліся не ў поўным аб'ёме, бо ўведзены ў розных правінцыях Кітая каранцін працягвае абмяжоўваць вытворчы працэс. Раней аналагічныя працэдуры былі здзейснены на заводах Toyota ў гарадах Чанчун і Гуанчжоу. На 24 лютага намечаны старт работы новага завода — у горадзе Чэнду. Яшчэ адзін японскі аўтаканцэрн Mazda таксама запусціў вытворчыя магутнасці ў горадзе Нанкін.

### Мірныя перагаворы ў Лівіі пад пагрозай зрыву

Лівійскі Урад нацыянальнай згоды (УНЗ) адмовіўся ад далейшых мірных перагавораў у Жэневе пасля абстрэлу галоўнага марскога порта Трыпалі. Урад абвінавачвае ва ўдарах Лівійскую нацыянальную армію, якая, у сваю чаргу, паведамляе аб тым, што было абстраляна турэцкае судна з грузам зброі для УНЗ. Спецпрадстаўнік генеральнага сакратара ААН у Лівіі Гасан Саламе пацвердзіў факт абстрэлу порта, заявіўшы пры гэтым аб парушэннях эмбарга на пастаўку ўзбраенняў, а таксама пра факты перакідвання замежных баевікоў у Лівію. Апошнія ўдары па сталіцы адбыліся на фоне распачатага ў Жэневе другога раўнда сустрэч Аб'яднанага ваеннага камітэта Лівіі («5 + 5»), накіраваных на дасягненне доўгатэрміновага рэжыму спынення агню. Як вядома, першы раўнд перагавораў па ваенных пытаннях прайшоў у Жэневе 3—8 лютага. Ваенны камітэт Лівіі ўключае па пяць прадстаўнікоў ад кожнага з бакоў канфлікту. Пасярэднікам на кансультацыях выступае Саламе.

### Экс-прэзідэнта Паўднёвай Карэі прыгаварылі да 17 гадоў турмы



Вышэйшы суд Сеула прызнаў былога прэзідэнта Рэспублікі Карэя Лі Мён Бака (кіраваў цягам 2008—2013 гадоў) вінаватым у прысваенні сродкаў і атрыманні хабару ў асабліва буйным памеры. Як паведаміла агенцтва Yonhap, колішняму кіраўніку краіны прызначана мера пакарання ў выглядзе турэмнага зняволення тэрмінам на 17 гадоў. Акрамя гэтага, 78-гадовага Лі Мён Бака абавязалі выплаціць штрафы на агульную суму каля 15,7 мільёна долараў. Ён быў узяты пад варту проста ў зале суда. Пракуратура падазравала былога кіраўніка дзяржавы ў прысваенні сродкаў кампаніі — вытворцы аўтамабільных запчастак DAS, найбуйнейшым акцыянерам якой з'яўляўся Лі Мён Бак, а таксама ў атрыманні хабараў ад Samsung Electronics падчас яго прэзідэнцтва.

Парламенцкі дзённік

# Дыялог праз акіян

## Народныя выбраннікі Беларусі і ЗША мусяць больш кантактаваць напрост

**Такое меркаванне выказаў старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі па міжнародных справах Андрэй САВІНЫХ на сустрэчы з кіраўніком сакратарыята камітэта па міжнародных адносінах Сената Кангрэса ЗША Крыстаферам СОЧАМ.**

Андрэй Савіных падкрэсліў, што гэта першая сустрэча парламенцкіх структур Беларусі і ЗША непасрэдна ў гістарычна важным будынку, дзе месціцца Палата прадстаўнікоў, — дагэтуль народныя выбраннікі кантактавалі ў асноўным на палях буйных парламенцкіх форумаў.

«Несумненна, мы можам канстатаваць, што Мінск і Вашынгтон прадукцыйна супрацоўнічаюць у абласцях супадзення інтарэсаў, па пытаннях бяспекі (гэта перш за ўсё барацьба са злачыннасцю, гандлем людзьмі, тэрарызмам, абыходжанне з радыеактыўнымі матэрыяламі). Узноўлены дыялог у ваеннай сферы, па лініі аховы здароўя, сельскай гаспадаркі, прафесійных абменаў», — адзначыў дэпутат і выказаў упэўненасць, што на фоне гэтых дасягненняў надышоў час для прамых кантактаў парламенцкіх структур.

На думку Андрэя Савіных, такія кантакты дазволяць нанова выбудаваць адносіны, што калісьці былі паміж нашымі краінамі, і працаваць на карысць абедзвюх дзяржаў.

У сваю чаргу, Крыстафер Соча паведаміў аб аптымізме, які з'явіўся ў дэлегацыі за кароткі час, праведзены ў Беларусі. Прадстаўнікоў ЗША натхнілі нашы поспехі ў эканоміцы, сферы высокіх тэхналогій і барацьбы з тэрарызмам.

«Як вы ведаеце, Кангрэс ЗША прыняў шэраг заканадаўчых актаў па тэме адносін з Беларуссю. Адна з мэт нашага візіту — на свае вочы паназіраць за прагрэсам, ажыццёўленым у Беларусі, і разабрацца, ці патрэбныя абнаўленні ў гэтых актах», — канстатаваў Крыстафер Соча. Ён падтрымаў ідэю парламенцкіх абменаў і выказаў надзею на ўмацаванне плыні інфармацыі паміж беларускімі ўладамі і Кангрэсам ЗША.

**Варвара МАРОЗАВА.**

Бяспека

# ГУБЕРНАТАРАЎ САБРАЛІ НА ВАЙСКОВЫ ЗБОР

**На базе палігона Лосвіда ў Віцебскім раёне прайшоў збор па пытаннях ваеннай бяспекі і абароны Беларусі з кіраўнікамі абласцей і горада Мінска, рэгіянальных камісарыятаў, паведамілі ў Міністэрстве абароны.**

Такія мерапрыемствы праводзяцца сістэматычна. «Сутнасць гэтага збору ў тым, што да ўдзельнікаў даведзены асаблівасці вядзення ўзброенай барацьбы на часова захопленай праціўнікам тэрыторыі, асноўныя тэндэнцыі змен ваенна-палітычнай абстаноўкі, падыходы Генштаба УС да арганізацыі і вядзення тэрытарыяльнай абароны», — адзначыў начальнік Генеральнага штаба — першы намеснік міністра абароны Беларусі Аляксандр Вальфовіч, перадае БелТА.

Была арганізавана дэманстрацыя ўзбраення, асаблівасцяў размяшчэння і парадку дзеянняў фарміраванняў тэрытарыяльных войскаў і падраздзяленняў сіл спецаперацый. Практычная частка збору ўключала адпрацоўку дзеянняў падраздзяленняў у населеным пункце і ў тыле праціўніка, у тым ліку з выкарыстаннем вадалазаў. Важнай часткай стала ўручэнне сцягоў тэрытарыяльнай абароны кіруючаму складу абласных і Мінскага гарадскога выканкамаў.

«Кожны мужчына павінен ведаць, як абараніць сваю сям'ю, а кіраўнік абавязаны разумець, як абараніць падуладны яму рэгіён. Змяняецца тэхніка, трэба ісці ў нагу з часам, разумець, з якой зброяй стаяць каля граніцы», — перакананы старшыня Віцебскага аблвыканкама Мікалай Шарснёў.

Пытанням тэрытарыяльнай абароны ўдзяляецца вялікая ўвага. 2020 год таксама будзе насычаны адпаведнымі мерапрыемствамі. Запланаваны вучэнні ў Гродзенскай, Гомельскай і Магілёўскай абласцях, штабныя трэніроўкі. Акрамя таго, як паведаміў Аляксандр Вальфовіч, Генштабам будуць праведзены раптоўныя комплексныя праверкі раённых штабоў тэрытарыяльнай абароны.

**Отчет об использовании имущества Местного благотворительного фонда памяти Георгия Кониsского (г. Могилев за 2019 год)**

1) Количество учредителей – 1 человек – Набоков Александр Васильевич.
2) Информация о стоимости имущества фонда – 2500 рублей. Имущество, переданное фонду учредителем, – 2500 рублей. Поступления от проводимых фондом мероприятий – нет. Доходы, полученные от осуществления в соответствии с уставом фонда предпринимательской деятельности, – нет, иных не запрещенных законодательством Республики Беларусь поступлениях – нет.
3) Общая сумма расходов, понесенных фондом на достижение общественно полезных целей, указанных в его уставе, – 2500 рублей.
4) Информация о количестве унитарных предприятий, хозяйственных обществ, созданных фондом для осуществления предпринимательской деятельности, в том числе в таких юридических лицах – нет.

УНП 791156999

Страховой полис, карту международного моторного страхования «Зеленая карта» серии BY07 № 17412257 страховой компании ЗАСО «Промтрансинвест» **считать недействительными в связи с утерей.**

УНП 100357923

Ва ўрадзе

# ЯК ЗНАЙСЦІ ЎНІВЕРСАЛЬНЫЯ ЛЕКІ АД НАРКАМАНІІ?

## Спробы ўвозу забароненых наркатычных рэчываў і выкарыстання Беларусі ў якасці краіны іх транзіту не скарачаюцца

**На чарговым пасяджэнні Прэзідыума Савета Міністраў Беларусі абмеркавалі супрацьдзеянне незаконнаму абароту наркотыкаў.**

«На фоне існуючай наркапагрозы нам удаецца эфектыўна ўплываць на сітуацыю, але, на жаль, спробы ўвозу забароненых рэчываў і выкарыстання Беларусі ў якасці краіны транзіту не скарачаюцца. У сувязі з гэтым дзейнасць праваахоўнікаў павінна быць адэкватнай выклікам і пагрозам, якія з'яўляюцца», — перадае словы **прэм'ер-міністра Сяргея РУМАСА** прэс-служба ўрада.

Прафілактыка наркаманіі — сфера адказнасці не толькі сілавых структур. Рэаліі патрабуюць перагляду формаў і метадаў работы з пункту гледжання як сацыяльна-эканамічнай эфектыўнасці, так і ўспрымання грамадствам.

Як падкрэсліў Сяргей Румас, універсальных лекаў ад наркаманіі не існуе і акрамя праваахоўнага складніка ў вырашэнні праблемы неабходна адладжаная сістэма рэабілітацыі і лячэння залежных.

«Аднак складанасць і шматгранасць праблемы наркаманіі такая, што і гэтых элементаў недастаткова для вызвалення ад залежнасці. Калі пацыенты пасля лячэння і рэабілітацыі пакінуты на волю лёсу, не арганізаваны працэс іх пастаяннай занятасці і сацыялізацыі, вяртання ў ранейшы заганны круг не пазбегнуць», — сказаў кіраўнік урада.

Па словах **міністра ўнутраных спраў Юрыя КАРАЕВА**, статыстыка нарказлачынстваў у краіне знізілася, але ўзрасла колькасць наркотыкаў, якія канфіскавалі. Летась здзейснена каля 4,5 тысячы злачынстваў у гэтай сферы — палова звязана са збытам.

«Самае галоўнае дасягненне: пачынаючы з 2015 года колькасць выпадкаў передазіровак з непаўналетнімі і, такім чынам, іх смерцяў скарацілася ў 37 разоў, у параўнанні з 2018 годам — у тры разы», — адзначыў Юрый Караеў.

Для транснацыянальных груповак Беларусь па-ранейшаму застаецца прывабнай краінай для транзіту. Да нас і праз нас ідуць пастаўкі як з усходу, так і з захаду. «Раслінныя наркотыкі ў асноўным ідуць з усходу на захад, а сінтэтычныя — з захаду на ўсход. Сінтэтычныя з'яўляюцца найбольш небяспечнымі, іх усяго 5 % у агульным спектры, але менавіта ад іх 60 % перадазіровак», — удакладніў кіраўнік МУС.

Па словах Юрыя Караева, падраздзяленні па барацьбе з наркотыкамі накіраваны на выяўленне не дробных спажыўцоў, а буйных партый, каналаў і актыўную дзейнасць у сферы прафілактыкі.

З ініцыятывы Міністэрства ўнутраных спраў у РНПЦ псіхічнага здароўя створаны пілотны цэнтр працяглай рэабілітацыі нарказалежных. Вынікі яго работы падвядуць у верасні. Магчыма, што пілотны праект стане пастаянным.

Юрый Караеў рэзюмаваў, што ў цэлым сітуацыя з незаконным абаротам наркотыкаў кантралюецца і з'яўляецца значна лепшай, чым у іншых краінах. «Але гэта такая сфера, што мы павінны за кожнага змагацца. Кожны чалавечы лёс нам дарагі, і трэба імкнуцца ў гэтым плане да ідэалу», — канстатаваў міністр.

**Марыя ДАДАЛКА.**

Добрая справа

# Можа, хросным паклічуць...

**Пад мігалкі нечаканага ганаровага эскорту гамяльчанку, якая ледзь не нарадзіла дзіця ва ўласнай машыне, у лічаныя хвіліны правялі да радзільні. У Гомелі інспектары ДАІ своечасова прыйшлі на дапамогу маладой сямейнай пары, а пасля прыехалі ў бальніцу на выпіску нованароджанай.**

Маленькая гамяльчанка вырашыла з'явіцца на свет крыху раней за спрагназаваны тэрмін і прымусіла бацькоў пахваляваацца. Раніцай маладая мама падняла мужа па трывозе: тэрмінова ў радзільню! Вырашылі не чакаць «хуткай» і дабірацца на сваёй машыне.

— Было 5-6 гадзін раніцы. Заўважылі аўтамабіль, які дзіўна паводзіў сябе на дарозе, — успамінаюць здарэнне **інспектары батальёна дарожна-патрульнай службы ДАІ Дзмітрый ВАСІЛЕНКА і Яраслаў ДЗЕГЦЯРОЎ.** — Ён паскараўся і рэзка абганяў. Не ўсюды яшчэ гарэлі святлафоры, кіроўца мог не заўважыць пешаходаў, таму вырашылі дагнаць аўтамабіль і праверыць, у чым справа.

Спынілі легкавушку, ацанілі далікатнасць сітуацыі і, уключыўшы пробліскавыя маячкі і гукавы сігнал, апэратыўна даставілі маладую маму ў бальніцу.

— Мы спачатку спалохаліся, калі нас спыніла ДАІ, але потым вельмі ўзрадаваліся, бо супрацоўнікі ДАІ дапамаглі дабрацца хутка і бяспечна, а праз некалькі гадзін на свет з'явілася наша дачка, — з удзячнасцю за хэпі-энд кажа Вераніка Серакова.



Фота прэс-службы ДАІ УУС Гомельскага аблвыканкама.

Увогуле яе дачка — апошнім часам галоўны ньюсмейкер радзільні. На выпіску да дзяўчынкі з падарункамі і віншаваннямі прыехаў экіпаж ДАІ. Тыя самыя інспектары. Дарэчы, маладыя бацькі вырашылі назваць малую Васіліса. Гэты варыянт імя разглядалі і раней, але вагаліся, пакуль не даведаліся прозвішча інспектара Дзмітрыя Васіленкі, які так перажываў за нованароджаную. Вырашылі — гэта знак!

**Наталля КАПРЫЛЕНКА.**

ФАКТЫ ПАДЗЕІ НАВІНЫ

### «НАСТАЎНІК ДЛЯ БЕЛАРУСІ» ЧАКАЕ НАВАБРАНЦАЎ

**Першая хваля набору ў праект «Настаўнік для Беларусі» завяршаецца 23 лютага.**

Стаць удзельнікамі праграмы могуць педагогі з любым вопытам работы (у тым ліку нядаўнія выпускнікі). Важна, каб яны былі гатовыя мяняцца, развівацца і змагацца з адукацыйнай няроўнасцю.

У верасні 2019 года дзевяць таленавітых настаўнікаў ужо адправіліся ў пяць рэгіянальных школ, каб даказаць, што якасная адукацыя можа быць даступная кожнаму беларускаму школьніку. Першыя «Настаўнікі для Беларусі» прайшлі тры этапы адбору і паўдзельнічалі ў летнім інтэнсіве. Сёння яны выйграюць гранты (Людміла Рыбчынская атрымала грант ад Google на правядзенне «Еўрапейскага тыдня коду»), запускаюць праекты для настаўнікаў, дзяцей і мясцовай супольнасці, збіраюць грошы праз краўдфандзінг на будаўніцтва дзіцячай пляцоўкі ў Павіцці і адкрыццё STEM-цэнтра ў пасёлку Энергетыкаў, арганізуюць тэатральныя студыі пры падтрымцы міжнароднага праекта «Праз тэатр» і кампаніі Vizor Games.

Падчас другога набору арганізатары спадзяюцца адабраць як мінімум 20 удзельнікаў, якія адправяцца ў 5-8 новых партнёрскіх школ. Першая хваля набору настаўнікаў заканчваецца 23 лютага, другая будзе доўжыцца да 4 мая. Школы могуць падаваць заяўкі на ўдзел у праекце да 1 красавіка.

Фонд «Новая школа», заснаваны БПС-Ашчадбанкам, кампенсуе ўдзельнікам праграмы выдаткі на арэнду жылля і забяспечвае педагогаў дадатковай стыпендыяй, а партнёр праграмы 21vek.by выдае ноўтбук і зніжку на іншыя рэчы, неабходныя для работы.

Больш інфармацыі можна знайсці на сайце http://teach4.by.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

### МІНЧАНІН САРВАЎ ЛЮСТЭРКІ З 17 АЎТО

**Супрацоўнікі крымінальнага вышуку Ленінскага РУУС Мінска затрымалі мужчыну, які нападпітку адарваў бакавыя люстэркі ў легкавых аўтамабіляў.**

Да супрацоўнікаў міліцыі звярнуліся жыхары Ленінскага раёна сталіцы і паведамілі, што невядомы пашкодзіў іх машыны.

Праваахоўнікі, азнаёміўшыся з запісамі з камер відэаназірання, устанавілі, што да хуліганскіх дзеянняў датычны 34-гадовы мінчанін. Мужчына, вяртаючыся дадому пасля карпаратыва, бесладстаўна стаў наносіць пашкоджанні аўтамабілям, якія стаялі ўздоўж дарогі. Мінчанін адрываў у транспартных сродкаў бакавыя люстэркі, пасля чаго выкідваў іх у смеццевы кантэйнер і ўцякаў. Такім чынам мужчына пашкодзіў 17 машын. Матыў свайго ўчынку затрыманы растлумачыць не змог, паколькі нічога не памятае. Прычынены ўрон склаў больш за 5100 рублёў. Вядома, што раней да крымінальнай адказнасці мінчанін не прыцягваўся.

### «ПАНІКОЎСКІ» НЕ КІНУЎ ПТУШКУ...

**У Столінскі РАУС паступіла паведамленне ад жыхара Давід-Гарадка пра тое, што ў яго з хлява скралі чатырох гусакоў.**

Сышчыкі ўстанавілі, што крадзеж здзейсніў непрацуючы раней судзімы жыхар аднаго з населеных пунктаў раёна, 1976 года нараджэння.

Мужчына расказаў праваахоўнікам, што ведаў пра наяўнасць птушак, таму ўначы пракраўся ў двор і не паверыў свайму шчасцю, калі ўбачыў незачыненыя дзверы хлява. Пасля чаго забраў гусей і схаваўся. Як паведамляе УУС Брэсцкага аблвыканкама, выкрадзеная маёмасць не вернута ўладальніку, бо была... з'едзена зламыснікам.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

Напярэдадні падзей

# Снег і зоркі будуць!

## Раўбічы працягваюць падрыхтоўку да чэмпіянату Еўропы па біятлоне

**У кантынентальным першынстве, якое стартуе 26 лютага ў Беларусі, возьмуць удзел 40 каманд: 157 біятланістаў і 140 біятланістак. Дарэчы, летась у чэмпіянаце Еўропы, які прымала таксама наша краіна, удзельнічалі 34 каманды.**

Зараз усе самыя тытулаваныя біятланісты выступаюць на чэмпіянаце свету ў Антхольцы, у тым ліку і беларуская зборная. Аднак некаторыя каманды ўжо заявілі, што і ў Раўбічах выступяць у наймацнейшым складзе. За беларускую зборную, напрыклад, выступяць Сяргей Бачарнікаў, Раман Ялётнаў, Антон Смольскі, Мікіта Лобастаў, Максім Варабей, Віктар Крыўко і Ягор Казарын у мужчын, Ірына Крыўко, Ганна Сола, Дзінара Алімбекава, Алена і Ірына Кручынкіны, Адэліна Сабітава і Дар'я Кудаева ў жанчын. Нагадаем, на леташнім чэмпіянаце Еўропы зборная Беларусі заваявала тры медалі: «серабро» ў пасьюце, «бронзу» ў індывідуальнай гонцы і змешанай эстафеце.

Таксама асноўным складам выступіць зборная Расіі. За медалі будуць змагацца Аляксандр Логінаў, Мацвей Елісееў, Яўген Гаранічаў, Кацярына Юрлава-Перхт, Святлана Міронава, Ірына Старых і іншыя. З Украіны прыедуць лідары Дзмітрый Підручны, Сяргей Сямёнаў, Арцём Прыма, Віта і Валянціна Семярэнкі, Алена Підгрушная. Балгарыю прадставяць Красімір Анеў, Уладзімір Іліеў, Мілена Тодарава.

Чэмпіянат Еўропы стартуе ў наступную сераду суперспрынтамі, у чацвер пройдуць адзіночная змешаная эстафета і класічная змешаная эстафета, а спрынтарскія гонкі і гонкі праследавання адбудуцца ў выхадныя.

Арганізатары сцвярджаюць, што «Раўбічы» ўжо гатовыя да турніру. На тэрыторыі спарткомплексу некалькі дзён таму пачала працаваць фабрыка па вытворчасці снегу. Двое сутак, пакуль стаялі невялікія маразы, снегавыя пушкі працавалі бесперапынна. Для таго каб падрыхтаваць трасу ў «Раўбічах» да правядзення чэмпіянату і этапу Кубка IBU, работнікі спарткомплексу нарыхтавалі 10 тысяч кубаметраў снегу. З яго цяпер робяць трасу. Калі гэтага будзе недастаткова, дапамагчы гатовыя беларускія гарналыжныя курорты. «Летась быў вельмі вялікі досвед: мы правялі чэмпіянат Еўропы, летні чэмпіянат свету. Таму ў нас усё для таго, каб правесці і гэты турнір, ёсць: і чалавечы патэнцыял, і суддзейская брыгада, ёсць усё абсталяванне», — адзначыў **дырэктар РЦАП па зімовых відах спорту Аляксандр ГАГІЕЎ.**

15 лютага стартаваў продаж квіткоў і абанементаў на гонкі адкрытага чэмпіянату Еўропы. Білеты можна набыць на Ticketpro.by або ў білетных касах, іх кошт стартуе ад 5 рублёў.

Акрамя чэмпіянату Еўропы, Раўбічы таксама захоўваюць за сабой права правядзення і заключнага этапу Кубка IBU (з 4 да 7 сакавіка). У рамках апошняга этапу прадугледжаны спрынтарскія гонкі і мас-старты. Склад нашай зборнай будзе вызначаны пазней, але асноўная зборная ў гэты час адправіцца на этап Кубка свету ў Чэхію.

**Расклад гонак чэмпіянату Еўропы:**

26.02 (серада) — суперспрынт, кваліфікацыя, мужчыны (13:00)
26.02 — суперспрынт, кваліфікацыя, жанчыны (15:00)
26.02 — суперспрынт, фінал, мужчыны (17:30)
26.02 — суперспрынт, фінал, жанчыны (18:00)

27.02 (чацвер) — адзіночная змешаная эстафета (14:00)
27.02 — змешаная эстафета (17:00)

29.02 (субота) — спрынт, мужчыны (12:30)
29.02 — спрынт, жанчыны (15:30)

01.03 (нядзеля) — гонка праследавання, мужчыны (12:30)
01.03 — гонка праследавання, жанчыны (14:30)

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.**

Сугучча

# Нашы кнігі ў Палтаве

**Толькі-толькі завяршыўся Міжнародны сімпозіум «Пісьменнік і час», які супаў з правядзеннем XXVII Мінскай міжнароднай кніжнай выстаўкі-кірмашу, як ад удзельнікаў форуму прыходзяць добрыя весткі. У Палтаве (Украіна), паведамляе літаратуразнаўца, перакладчык, культуролаг Глеб Кудрашоў, прынята рашэнне адкрыць у мясцовым універсітэце Цэнтр украінска-беларускіх кніжных сувязяў.**

Своеасаблівая лабараторыя дружбы паміж дзвюма культурамі, дзвюма літаратурамі будзе працаваць на факультэце філалогіі і журналістыкі. Аснову цэнтра складзе бібліятэка беларускай літаратуры, якую Міністэрства інфармацыі Беларусі перадало ў Палтаву ў маі 2019 года. Мяркуецца, што такая ж бібліятэчка будзе перададзена ва ўніверсітэт і сёлета. Навінкі беларуская кнігавыдання паступяць у Палтаву у межах праграмы па падтрымцы беларусаў замежжа, якую рэалізоўваюць сумесна міністэрствы замежных спраў і інфармацыі Беларусі.

Мяркуецца, што Цэнтр украінска-беларускіх кніжных сувязяў адкрыецца ў верасні 2020 года.

Варта нагадаць, што Глеб Кудрашоў неаднойчы бываў у Беларусі, з'яўляецца аўтарам кнігі пра шаўчэнкаўскія адрасы памяці ў нашай краіне.

**Сяргей ШЫЧКО.**

# На агранома — без экзаменаў?

## КУРС НА «МЭТАВІКОЎ»

У Гродзенскай вобласці кадры для АПК рыхтуюць чатыры каледжы і аграрны ўніверсітэт. Менавіта з вышэйшай установы выйшла 67 % кіраўнікоў і спецыялістаў рэгіёна. У асноўным тут вучацца жыхары вобласці, але ёсць і невялікі працэнт прыезджых, у асноўным з Брэсцкай вобласці.

— Цяпер не толькі ў нас, але і ў іншых краінах зніжаецца колькасць сельскага насельніцтва. І многія гаспадаркі сутыкаюцца з праблемай забеспячэння кадрамі. Для нас рашэнне гэтага пытання асабліва важна, бо зямля і людзі — наша галоўная каштоўнасць, — падкрэсліў Іван Лаўрыновіч.

**Многія спецыялісты развітваюцца з сельскай гаспадаркай на другім этапе аграрнай лесвіцы — пасля вучобы. Яны прыехалі ў гаспадарку, папрацавалі, сутыкнуліся з рэальнай працай і... не вытрымалі. Такіх нямала.**

Здаецца, спецыялістаў рыхтуюць нямала. Кожны год — амаль паўтары тысячы студэнтаў розных формаў навучання. Усе бюджэтнікі, як правіла, раз'язджаюцца па размеркаванні. Пры гэтым нямала маладых людзей едзе працаваць бліжэй да дома, у свой раён. Але аказваецца, што многія раёны амаль не маюць «сваіх» выпускнікоў. Зразумела, што і ехаць у раён няма каму. Таму размяркоўваюць «чужых», але многія, як вядома, не затрымліваюцца надоўга.

**Рэктар Гродзенскага дзяржаўнага аграрнага ўніверсітэта Вітольд ПЕСЦІС** прывёў такія факты: з выпускнікоў, якія былі размеркаваны ў 2015 годзе, на першым працоўным месцы засталася толькі трэціна. Праз год лічба крыху вырасла, а яшчэ праз год замацавалася на ўзроўні 50 %. Гэта тыя выпускнікі, якія ўжо адпрацавалі два гады і засталіся надалей.

Здаецца, што кадравае забеспячэнне толькі расце. Але не варта забываць і пра адток спецыялістаў. Летась гэтая лічба ў рэгіёне дасягнула васьмі тысяч чалавек. Цяпер, напрыклад, ёсць вакансіі галоўных аграномаў, ветэрынараў, трактарыстаў і нават восем вакансій кіраўнікоў гаспадарак.

Таму маладыя спецыялісты вельмі патрэбны. Вось чаму важна, каб такія сельскагаспадарчыя раёны, як Карэліцкі, Іўеўскі, Зэльвенскі і іншыя, накіроўвалі на вучобу не аднаго-двух жыхароў раёна, а столькі, колькі патрэбна для работы ў мясцовых гаспадарках. Увогуле, як адзначыў рэктар універсітэта, 60 % бюджэтнікаў павінны вучыцца па мэтавым накіраванні. Пакуль такога няма.

## СТАЎКА НА КАМФОРТ І ЗАРПЛАТУ

Многія спецыялісты развітваюцца з сельскай гаспадаркай на другім этапе аграрнай лесвіцы — пасля вучобы. Яны прыехалі ў гаспадарку, папрацавалі, сутыкнуліся з рэальнай працай і... не вытрымалі. Такіх нямала.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

А між тым кіраўнікі гаспадарак сцвярджаюць, што ствараюць для іх спрыяльныя ўмовы. Па словах **старшыні СВК «Сынкавічы» Зэльвенскага раёна Дзмітрыя ДЗЯШКО,** зарплата ў гаспадарцы добрая — 1030 рублёў, у заатэхніі — 1300—1500 рублёў. Асобная ўвага ўдзяляецца вольнаму часу работнікаў. З дапамогай гаспадаркі ў мясцовай школе абсталявана трэнажорная зала. Працуе валейбольная секцыя, штогод праводзяцца турніры. Па жаданні арганізуюцца экскурсіі.

На тэрыторыі гаспадаркі працуюць дзве сталоўкі. Работнікі плацяць толькі палову кошту, такім чынам паўнавартасны абед абыходзіцца ў паўтары рублі. Для маладых спецыялістаў ёсць пакоі ў двухкватэрным доме. Цяпер у гаспадарцы чакаюць двух «мэтавікоў», якія праходзяць службу ў арміі. Між тым патрэба ў кадрах тут існуе, палова накіраваных у гаспадарку спецыялістаў з'язджае.

А вось у СВК імя Сянько Гродзенскага раёна патрэбы ў кадрах не існуе. Як расказаў **старшыня гаспадаркі Валерый ШУМЕЛЬ,** за пяць гадоў з 12 выпускнікоў аграрнага ўніверсітэта звольніліся толькі два.

Сёння паўстае пытанне мэтавага навучання. Кіраўнік не бачыць сэнсу ў «мэтавіках» для моцных гаспадарак. Бо дагавор з абавязковым прыёмам на працу заключаецца на пяць год. Часта бывае, што выпускнік прыходзіць, а вакансіі няма. Скасаваць дагавор без згоды маладога спецыяліста немагчыма.

— У нас быў такі прэцэдэнт, — кажа Валерый Шумель. — Прыйшлі адразу тры «мэтавікі». Каб усіх замацаваць, прыйшлося ствараць дадатковыя пасады. Мала таго, праз тры месяцы яны ідуць у армію. Што рабіць з новымі вакансіямі? Зноў ліквідаваць? Таму апошнім часам мы не практыкуем такія доўгатэрміновыя дагаворы. Для нас самы спрыяльны варыянт — тыя студэнты, якія былі на практыцы, добра сябе паказалі і маюць жаданне працаваць у гаспадарцы.

Але бяруць далёка не кожнага. У асноўным тых, хто мае высокі бал. І гэта зразумела. Гаспадарка — адна з самых моцных у рэгіёне, сярэдняя зарплата амаль 1300 рублёў. Галоўныя спецыялісты атрымліваюць 2300 рублёў, сярэдняга звяна — 1,5 тысячы. Гаспадарка пастаянна будуецца. Вось і сёлета тут уводзіцца 16-кватэрны дом, дзе палова адведзена спецыялістам. Ёсць даволі значны сацыяльны пакет. Тыя, хто адпрацаваў тры гады, становяцца членамі калгаса. А гэта і 13-я зарплата, і магчымасць выкупіць жыллё...

Увогуле, цэнтр гаспадаркі — аграгарадок Абухава — уключаны ў дзяржаўны спіс «вёска будучага». Зразумела, што ў такіх гаспадарках, дзе ўмовы жыцця набліжаны да гарадскіх, працаваць не толькі выгадна, але і прэстыжна. Але стварыць такія ўмовы — задача не толькі аграрыяў.

## У ГОНЦЫ ЗА ВЫШЭЙШАЙ АДУКАЦЫЯЙ?

Адток работнікаў і маладых спецыялістаў з гаспадарак абумоўлены яшчэ і слабой матывацыяй самых студэнтаў. Не сакрэт, што многія паступаюць у ВНУ таму, што тут невысокі конкурс. Затое ёсць дыплом аб вышэйшай адукацыі. Такая сітуацыя непакоіць вопытных аграрыяў, якія памятаюць, праз які конкурсны адбор ім прыйшлося прайсці, каб трапіць у сельскагаспадарчы інстытут (статус універсітэта атрыманы ў 2005 годзе).

Менавіта такую прычыну бачыць у нізкай замацаванасці маладых спецыялістаў **старшыня СВК «Негневічы» Навагрудскага раёна Юрый КУЦКО.** На яго думку, цяпер атрымаць вышэйшую адукацыю нескладана. І сапраўды. Конкурс у аграрны ўніверсітэт невысокі, асабліва на агранамічным і заатэхнічным факультэтах, якія складаюць аснову сельскагаспадарчай вытворчасці. Можна сказаць, што конкурс наогул адсутнічае, бо складае 1,2 чалавекі на месца.


Фота з сайта ГДАУ.

— У нашай гаспадарцы за тры гады звольнілася шэсць маладых спецыялістаў з дзесяці. Здаецца, і зарплата добрая — больш за тысячу рублёў, і жыллём забяспечаны, а сыходзяць, — канстатуе Юрый Куцко. — Калі я паразмаўляў з імі, упэўніўся, што яны наогул не збіраюцца працаваць у гэтай галіне, а паступалі, каб мець дыплом. Гэта выпадковыя людзі. Таму трэба больш шчыльна весці адбор, кіравацца матываванымі студэнтамі.

Паступілі прапановы і з боку кіраўнікоў перапрацоўчых прадпрыемстваў. На іх думку, пры падрыхтоўцы студэнтаў варта звярнуць больш увагі на маркетынг. Цяпер вельмі важна ўмець прадаць сваю прадукцыю. А ВНУ якраз і рыхтуе спецыялістаў у галіне перапрацоўкі. Таксама важна, каб спецыялісты разбіраліся ў заканадаўстве па дзяржаўных закупках. Цяпер у праграме няма асноў права, іх замянілі вывучэннем антыкарупцыйнага заканадаўства.

## ВАЙСКОВЫ БАР'ЕР

Яго даводзіцца пераадольваць і маладым спецыялістам, і гаспадаркам, куды яны накіраваны. Асабліва гэта датычыцца ветэрынарных спецыялістаў як найбольш запатрабаваных. Толькі яны ўцягнуліся ў працоўную дзейнасць, наладзілі працэс, як месяц ісці ў армію. А праз год зноў трэба пачынаць амаль што з нуля, выказваюцца прадстаўнікі гаспадарак.

Таму некаторыя калгасы, каб не браць будучых вайскоўцаў, да таго ж яшчэ і без стажу работы, пераманьваюць спецыялістаў з суседніх альбо іншых гаспадарак. Так адбываецца таму, што кіраўнік не заўсёды ўпэўнены, што ўчарашні выпускнік застанецца пасля адпрацоўкі, у той час калі спецыяліст са стажам ужо вызначыўся з работай. На думку кіраўнікоў гаспадарак, добрым выйсцем могуць стаць служба ў рэзерве і адпрацоўка не два гады, а пяць, як пакуль гэта робяць «мэтавікі». Ёсць шанс, што за гэты час малады спецыяліст замацуецца на сваім месцы і не збяжыць, напрыклад, у камерцыйныя структуры, як гэта часта цяпер здараецца.

Дарэчы, для тых, хто адслужыў у арміі, ужо прадугледжаны і пэўныя прэферэнцыі ў адпаведнасці з указам Прэзідэнта. Напрыклад, дэмабілізаваныя вайскоўцы маюць дадатковыя льготы для падрыхтоўкі пры паступленні ў навучальныя ўстановы, а таксама прыярытэт у выбары месца працы пры размеркаванні.

Што да паступлення ў ВНУ без экзаменаў — гэта рэальная перспектыва і яна будзе датычыцца выпускнікоў аграрных класаў. Такі мемарандум рыхтуецца. Выпускнікі змогуць стаць студэнтамі ВНУ па выніках суразмовы. Аб гэтым паведаміў **памочнік Прэзідэнта — інспектар па Гродзенскай вобласці Іван ЛАЎРЫНОВІЧ.**

## АГРАРНЫЯ КЛАСЫ — РЭЗЕРВ ВНУ І КАЛЕДЖАЎ

Сёлета ў вобласці адбудзецца першы выпуск агракласаў. Усяго 215 чалавек. Яны ёсць у кожным раёне. Па словах **начальніка галоўнага ўпраўлення адукацыі Гродзенскага аблвыканкама Руслана АБРАМЧЫКА,** вобласць лідзіруе ў краіне па колькасці агракласаў і па падыходах навучання.

Цяпер вядзецца работа па заключэнні мэтавых дагавораў на іх вучобу ў аграрным універсітэце, каб уцягнуць у гэты працэс як мага больш выпускнікоў.

Што такое аграрны клас? Гэта факультатыўныя групы 10—11-класнікаў, якія вывучаюць на працягу 140 гадзін увядзенне ў аграрныя прафесіі. Праграма, якая распрацавана спецыялістамі вядучых аграрных вышэйшых навучальных устаноў краіны, не толькі знаёміць са структурай вытворчасці, арганізацыі АПК, але і дае ўяўленне аб тэхнічным прагрэсе ў сельскай гаспадарцы, маштабах і перспектывах трансгенных тэхналогій.

Патрабаванні для вучняў наступныя — сярэдні бал не ніжэй пяці, а па профільных прадметах — не ніжэй шасці. Ёсць класы, куды залічваюць і з большым сярэднім балам.

У сувязі з гэтым хачу прыгадаць сустрэчу з прадстаўнікамі агракласа Ражанкаўскай сярэдняй школы падчас нядаўняга наведвання Шчучынскага раёна. **Намеснік дырэктара Аксана ДАШКЕВІЧ** расказала, што ў іх агракласах сярэдні бал не ніжэй сямі. Усяго ў класе дзевяць вучняў, з іх большасць будзе паступаць у ГДАУ. Мясцовая гаспадарка гатова даць мэтавае накіраванне і плаціць стыпендыі. Вучні маюць

**З выпускнікоў, якія былі размеркаваны ў 2015 годзе, на першым працоўным месцы засталася толькі трэціна.**

добрае ўяўленне аб будучай працы, часта бываюць у гаспадарцы ва ўсіх яе падраздзяленнях. Нядаўна тут пабудавалі два дамы для маладых спецыялістаў. Вучаніца агракласа Анжэла Жвірбля збіраецца стаць інжынерам-тэхнолагам. Менавіта стварэнне такога класа і больш цеснае знаёмства з будучай прафесіяй умацавалі яе ў гэтым выбары, хоць раней яна думала стаць юрыстам.

Дарэчы, звязаць сваё жыццё з сельскай гаспадаркай гатовы 8,6 % гродзенскіх школьнікаў. Сацыялагічнае апытанне было праведзена сярод адной тысячы старшакласнікаў. Пераважная большасць — амаль 40 % — бачыць сябе ў педагагічнай працы, 20 % — у медыцыне і столькі ж у сферы IT-тэхналогій. Па словах **начальніка галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы і па справах моладзі Аляксандра ВЯРСОЦКАГА,** які агучыў вынікі апытання, працэнт будучых аграрыяў не такі і нізкі. У краінах Еўропы ён складае 5 %. Галоўнае, каб з гэтай аўдыторыяй старанна працавалі.

Апытанне закранула і маладых спецыялістаў. Амаль палова з іх адказалі, што іх праца адпавядае таму, чаго яны чакалі ад працоўнага месца. А тыя, хто расчараваўся ў прафесіі, сярод прычын назвалі нізкую зарплату, слабую інфраструктуру населенага пункта і арганізацыю вольнага часу, а таксама цяжкую працу. Што датычыцца заробкаў, 43 % рэспандэнтаў жадалі б мець зарплату ад 500 да тысячы рублёў, другая палова — ад тысячы да 1,5 тысячы рублёў і 8 % — звыш 1,5 тысячы рублёў.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**

Сямейная газета
Выпуск № 4 (140)

## «Чэсна-чэсна»

*Прыяцелька кажа, што амаль штовечар «ваюе» з сынам-школьнікам: «Ты дамашку зрабіў? — Так. — А калі праверу? — Ну, зараз зраблю». Гэта «зараз» расцягваецца да гадзіны, але галоўнае, што крыўдзіць жанчыну — сын хлусіць, што ён робіць урокі, што напісаў даклад, але забыў дома, што атрымлівае адзнакі, лепшыя за сапраўдныя — пры тым, што ніхто ў сям'і на яго за «шасцёрку» замест «дзявяткі» не сварыцца. «Пытаюся, чаму падманвае — пацiскае плячыма, мармыча нешта. А я перажываю: калі хлусіць у малым, то ці можна яму давяраць у большым, або трэба кантраляваць ва ўсім аж да прызыву ў армію?» — дзеліцца перажываннямі маці.*

*Неабыякавыя бацькі, мяркую, не раз і не два спыталі і прачыталі ў спецыялістаў пра тое, чаму дзеці падманваюць і што з гэтым рабіць. (Напрыклад, выпуск анлайн-праграмы пра дзіцячую хлусню адзін са сталічных бацькоў праслухаў ажно 17 разоў!) І, вядома, яны ведаюць пералік найбольш частых прычын — страх пакарання, недахоп любові, павышэнне самаацэнкі (працей кажучы, пахвальба), і фантазёрства, спробы маніпуляцыі, уласцівы падлеткам пратэст, усталяванне асабістых межаў, а таксама праблемы ў сям'і, з якіх дзіця такім чынам шукае выйсце... Але ў кожным канкрэтным выпадку трэба шукаць «тую самую» прычыну і правільную рэакцыю на падман — псіхолагі гавораць, што адным пакараннем і ўзмацненнем кантролю тут нічога не вырашыш, хутчэй, наадварот, рана ці позна праблема вернецца ў больш сур'ёзных маштабах...*

*Чаму дзеці хлусяць? Таму што, будзем справядлівымі, хлусяць усе — нехта пастаянна, нехта зрэдку, нехта ў выключных выпадках, але ў любым выпадку не існуе людзей, якія б ніколі ў жыцці нікому ні разу не сказалі няпраўды (і калі, чытаючы гэтыя радкі, скажаце, што такі чалавек вы — віншую, «гражданин соврамши»). Бытуе нават сцвярджэнне, што сярэднестатыстычны чалавек хлусіць тройчы за дзесяць хвілін размовы — да такой высновы прыйшоў амерыканскі вучоны з Масачусецкага ўніверсітэта Роберт Фельдман. Але не палохайцеся: сцвярджэнне датычыцца толькі першай размовы паміж двума (і больш) не знаёмымі раней людзьмі, то-бок, сітуацыі, калі трэба ці хочацца зрабіць добрае ўражанне — напрыклад, падчас сумоўя пры прыёме на працу, першага спаткання, першай сустрэчы былых аднакласнікаў праз шмат гадоў пасля выпуску... І ўсё ж прыміце як аксіёму — мы ўсе хлусім, ад дзетсадаўцаў да пенсіянераў. І пра гэта, дарэчы, таксама трэба расказваць дзецям, для якіх падман аднагодкаў і тым больш дарослых, каторым яны давяралі, можа стаць сапраўдным шокам.*

*А каб патрабаваць ад дзіцяці шчырасці і выбудоўваць даверлівыя, узаемапаважлівыя стасункі, ёсць толькі адзін шлях — асабісты прыклад і ўменне паставіць сябе на месца іншага. Не толькі падкрэслівайце, але і паказвайце самі, што ў гэтым ёсць смеласць і гонар — сказаць праўду, узяць на сябе адказнасць за пэўны ўчынак ці памылку, нават калі рабіць гэта непрыемна. Ціск, павышэнне голасу і абвінавачванні — прамыя праціўнікі размовы па душах, у вашым арсенале мусяць быць спакойны тон, гатоўнасць і ўменне выслухаць, імкненне справядліва разабрацца ў сітуацыі і, самае важнае, выкананне дадзеных абяцанняў («я не буду на цябе крычаць і сварыцца, што б ні адбылося, мы ва ўсім разбярэмся і з усім справімся разам»). І яшчэ, хоць многім бацькам цяжка гэта прыняць, помніце пра асабістыя межы: як дарослыя маюць поўнае права ўтойваць пэўныя эпізоды свайго жыцця, так і дзеці маюць патрэбу ў сваёй недатыкальнай прасторы, сваіх сакрэтах. Чэсна-чэсна.*

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**

Тыя, хто побач

**Ганна АЛЬХОЎСКАЯ:**

# «Часам дзеля будучыні дзяцей і трэба скасаваць шлюб»



Улада і Ганна АЛЬХОЎСКІЯ.

**Ганна і Улада Альхоўскія — вядомыя беларускія пісьменніцы і сцэнарысткі. А ў жыцці мама і дачка — вялікія сяброўкі. Іх кнігі — дэтэктыў, фэнтэзі ці любоўны раман — лёгкія і аптымістычныя, як і самі жанчыны. Нават калі сямейнае жыццё Ганны пайшло пад адхон, яна не дазволіла сабе «раскісаць», а адкрыла новую, захапляльную старонку сваёй біяграфіі.**

Мы сустрэліся ў кавярні, і калі б я загадзя не ведала, хто мае суразмоўніцы, падумала б, што гэта, хутчэй, сёстры з пэўнай розніцай ва ўзросце, чым мама і дачка. І справа не столькі ў знешнім выглядзе, колькі ў зносінах, пазбаўленых іерархіі, але з такім цяплом, якое можа быць толькі ў вельмі блізкіх і родных людзей.

***— Ганна, напэўна, вы выйшлі замуж гадоў у 18?***

**Ганна:** — А я думала, вы спытаеце, хто мой касметолаг *(смяецца)*. Замуж выйшла ўжо ў свядомым узросце — у 25 гадоў. З мужам пазнаёмілася на працы, у нас быў класічны службовы раман. І ў той час, і цяпер мне здаецца, што гэта добрая магчымасць лепей пазнаць чалавека. Тады на спатканнях, цяпер у сацсетках усе імкнуцца быць лепшымі, чым насамрэч. Зрэшты, да канца пазнаць чалавека, напэўна, немагчыма, нават пражыўшы з ім шмат гадоў.

***(Заканчэнне на 5-й стар. «СГ».)***

# ПРАЦАВАЦЬ НЕЛЬГА НАРАДЖАЦЬ,

## або Адкуль паходзіць дэкрэтафобія?

**Колькі гадоў? Замужам? Дзеці ёсць? Нараджаць збіраешся? Гэтыя пытанні, якія мы, жанчыны, даўно прывыклі чуць на сумоўях, насамрэч з'яўляюцца дыскрымінацыяй. Замужнія жанчыны да 35 гадоў без дзяцей, незамужнія жанчыны да 35 гадоў без дзяцей, жанчыны з дзецьмі да дзесяці гадоў і жанчыны ў дэкрэце... Вось найбольш уразлівыя групы працаздольных людзей у Беларусі. Прычым гэта непасрэдна звязана з іх сямейным становішчам, сцвярджаюць даследаванні аб'яднання «Гендарныя перспектывы».**




Фота Ірыны СІДАРОК.

### «Вы нам не падыходзіце!»

Рэпрэзентатыўнае нацыянальнае апытанне «Гендарныя перспектывы» правялі ў 2018 годзе. Вывучаючы рынак працы ў цэлым, эксперты ўлічвалі дыскрымінацыю падчас прыёму на работу (пытанні, якія не могуць прысутнічаць у патрабаваннях да суіскальнікаў), а таксама непасрэдна на рабоце, у тым ліку сексуальную, гаворыць **Алена АРЦЁМЕНКА, даследчык і сацыёлаг.**

Згодна з апытаннем, з дыскрымінацыяй пры працаўладкаванні ці на рабочым месцы сутыкаліся 85 % беларусаў. Пытанні пра сямейнае становішча падчас прыёму на работу задавалі ў 27 % выпадкаў, прычым часцей за ўсё жанчынам. У прыёме на работу адмаўлялі з-за наяўнасці дзяцей 6 % апытаных. З-за сямейнага становішча і планаў на дзяцей — 5 %. З-за цяжарнасці — каля 1,5 %.

Дыскрымінацыя на рабоце праяўляецца ў непавышэнні заробку, непрасоўванні па службе, непрыемных жартах, часта звязаных менавіта з полам. З гэтым сутыкаліся 5 % рэспандэнтаў-мужчын і 20 % жанчын.

— Мы задаліся пытаннем, з якімі цяжкасцямі сутыкаецца жанчына падчас водпуску па доглядзе за дзіцем і выхаду на працу пасля дэкрэту. Каля 26 % жанчын мелі тут пэўныя праблемы, — канстатуе Алена Арцёменка.

Часцей з ўсё, гэта адмова пераводу на больш лёгкія ўмовы працы (з чым сутыкнуліся 13 % жанчын). 8 % жанчын адмовілі ў рабоце з-за цяжарнасці, 7 % схілялі да пераходу на іншую пасаду пасля выхаду з дэкрэту, а 4 % адмаўлялі працягваць кантракт з-за цяжарнасці.

***(Заканчэнне на 2-й стар. «СГ».)***

Сацыяльная кансультацыя

# Сямейны капітал — для аплаты медпаслуг

**Цяпер сямейным капіталам можна распараджацца, не чакаючы, пакуль дзіцяці, на якога ён аформлены, споўніцца 18 гадоў. Напрыклад, яго можна выкарыстаць для аплаты медыцынскіх паслуг, у тым ліку стаматалагічных.**

Сродкі сямейнага капіталу можна будзе выкарыстаць для аплаты неабходных медыцынскіх вырабаў, якія не ўключаны ў Рэспубліканскі фармуляр медыцынскіх вырабаў пры выкананні складаных і высокатэхналагічных умяшанняў у кардыяхірургіі, нейрахірургіі, анкалогіі, а таксама для набыцця іншых лекавых сродкаў замест уключаных у Рэспубліканскі фармуляр лекавых сродкаў. У стаматалагічныя паслугі, якія можна будзе аплаціць сродкамі сямейнага капіталу, уваходзяць пратэзаванне зубоў, дэнтальная імплантацыя з наступным пратэзаваннем, артадантычная карэкцыя прыкусу.

Але, як растлумачылі ў Міністэрстве працы і сацыяльнай абароны, трэба ведаць, што з 1 студзеня гэтага года зменены пералік дакументаў, якія павінна падаць сям'я ў мясцовы выканкам для прыняцця рашэння аб прызначэнні сямейнага капіталу і распараджэнні яго сродкамі (у тым ліку датэрмінова).

## ЯКІЯ ДАКУМЕНТЫ ПАТРЭБНЫ?

Для датэрміновага распараджэння сродкамі сямейнага капіталу для аплаты медпаслуг неабходна прадставіць: заяву; пашпарт або іншы дакумент, які сведчыць асобу; рашэнне або копію рашэння (выпіску з рашэння) аб прызначэнні сямейнага капіталу; заключэнне ўрачэбна-кансультацыйнай камісіі дзяржаўнай арганізацыі аховы здароўя аб патрэбе ў атрыманні членам (членамі) сям'і платных медыцынскіх паслуг, з указаннем медыцынскай паслугі;

дакумент, які сведчыць асобу, і (або) пасведчанне аб нараджэнні члена сям'і, які мае патрэбу ў атрыманні платных медыцынскіх паслуг па заключэнні ўрачэбна-кансультацыйнай камісіі дзяржаўнай арганізацыі аховы здароўя;

дакументы, якія сведчаць асобу, і (або) пасведчанне аб нараджэнні, выпіскі з рашэнняў суда аб усынаўленні (удачарэнні), аб адхіленні ў бацькоўскіх правах ці іншыя дакументы, якія пацвярджаюць уключэнне ў склад сям'і грамадзяніна, не ўлічанага ў яе складзе пры прызначэнні сямейнага капіталу (прадстаўляюцца на дзяцей, якія маюць патрэбу ў атрыманні платных медыцынскіх паслуг па заключэнні ўрачэбна-кансультацыйнай камісіі дзяржаўнай арганізацыі аховы здароўя, калі яны не былі ўлічаны ў складзе сям'і пры прызначэнні сямейнага капіталу);

дакументы, якія пацвярджаюць сваяцтва ў адносінах да членаў сям'і (пасведчанне аб нараджэнні, пасведчанне аб шлюбе, аб змене імя, выпіска з рашэння суда аб усынаўленні (удачарэнні) і іншыя), — у выпадку змены прозвішча, уласнага імя, імя па бацьку, даты нараджэння паўналетняга члена сям'і, таго, хто звярнуўся па датэрміновае распараджэнне сродкамі сямейнага капіталу, і (або) члена сям'і, якому патрэбныя платныя медыцынскія паслугі па заключэнні ўрачэбна-кансультацыйнай камісіі дзяржаўнай арганізацыі аховы здароўя;

пасведчанне аб смерці або даведка органа загса, якая змяшчае звесткі з запісу акта аб смерці, копія рашэння суда аб аб'яўленні грамадзяніна памерлым, аб прызнанні яго зніклым без вестак, копія рашэння суда аб скасаванні шлюбу або пасведчанне аб скасаванні шлюбу ці іншы дакумент, які пацвярджае выключэнне са складу сям'і грамадзяніна, якому прызначаны сямейны капітал, або немагчымасць яго звароту, — у выпадку звароту паўналетняга члена сям'і, які не з'яўляецца грамадзянінам, катораму прызначаны сямейны капітал, або законнага прадстаўніка непаўналетняга члена сям'і, які не адносіцца да членаў сям'і.

## КУДЫ ЗВЯРТАЦЦА?

Для датэрміновага распараджэння сродкамі сямейнага капіталу грамадзяне звяртаюцца ў мясцовыя выканаўчыя і распарадчыя органы па месцы прызначэння сямейнага капіталу або ў адпаведнасці з рэгістрацыяй па месцы жыхарства (месцы знаходжання).

**Падрыхтавала Святлана БУСЬКО.**

# ПРАЦАВАЦЬ НЕЛЬГА НАРАДЖАЦЬ

## «Штраф» за бацькоўства

Магчымасць ісці ў дэкрэт у Беларусі замест матулі прадастаўляецца тату ці іншым сваякам жанчыны. Аднак дагэтуль яна не вельмі папулярная, таму што на рынку працы існуе нераўнапраўе паміж заробкамі мужчын і жанчын. 39 % татаў сведчаць, што ім эканамічна нявыгадна даглядаць дзіця, бо яны зарабляюць больш, чым жонкі. Сапраўды, калі ў 2005 годзе сярэдні ўзровень жаночага заробку складаў 79,1 % ад мужчынскага, то ў 2018 ён знізіўся да 72,7 %, канстатуе **Марыя АКУЛАВА, эксперт цэнтра эканамічных даследаванняў BEROC.**

Узровень розніцы паміж заробкам меншы ў прыватным сектары.

— Магчыма, з-за таго, што ў камерцыйных структурах не існуе штатных раскладаў і тарыфных ставак. Працадаўцы глядзяць на ўзровень кваліфікацыі, на тое, які здабытак ты прынясеш кампаніі, — мяркуе яна.

У эканамічных даследаваннях існуе такі тэрмін, як «штраф за бацькоўства». Для мужчын гэта з'ява не характэрная.

— А вось для жанчыны, у якой ёсць дзіця, «штраф за бацькоўства» складае 14,5 % — настолькі менш яна будзе зарабляць, чым жанчына, у якой дзяцей няма. «Штраф» будзе вар'іравацца ў залежнасці ад узросту дзіцяці — чым ён меншы, тым большыя страты, — кажа Марыя Акулава.

Адукацыйны ўзровень таксама ўплывае на памер зніжэння заробку. Высокакваліфікаваныя жанчыны губляюць 20,4 %, з сярэднетэхнічнай адукацыяй — 13 %, а жанчыны з сярэдняй адукацыяй — 8 %.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «СГ».)*



— Складана казаць, ці дыскрымінацыя гэта. Хутчэй, гэта асаблівасці функцыянавання рынку працы, — дадала спецыяліст. — З аднаго боку, у нас шчодрая дзяржпадтрымка мацярынства. З іншага — трохгадовы дэкрэт прыводзіць да пагаршэння якасці кваліфікацыі жанчыны. За гэты час яна становіцца менш канкурэнтаздольнай, бо не мае магчымасці развівацца. Беларусі, пэўна, прыйдзецца скарачаць тэрмін дэкрэту, бо гэта негатыўна сказваецца на росце ВУП краіны і мы ставім жанчын у няроўныя ўмовы на рынку працы. Інфраструктуры, каб выйсці на працу раней, не існуе, а няня абыходзіцца дорага. Сярэднестатыстычнай сучаснай сям'і не патрэбна пяць дзяцей. Чым вышэй эканамічнае развіццё краіны, тым менш там нараджальнасць, бо для людзей больш важна інвеставаць у чалавечы капітал дзіцяці, а не ў іх колькасць. Многія краіны стымулююць не столькі фінансавую падтрымку нараджальнасці, колькі сумяшчэнне працы і нараджэння дзяцей з наладжваннем адпаведнай інфраструктуры.

## «Касмічная» работа і рэальнасць

Ва ўсіх правілах ёсць выключэнні. У IT-кампаніях, напрыклад, навучанне супрацоўнікаў вельмі дарагое, яно доўжыцца практычна год, таму больш выгадна іх затрымліваць, чым шукаць новых, упэўнена **Таісія ПАСТУХОВА, PR-партнёр кампаніі SoftTeco.** У іх арганізацыі рэалізуецца праект «Гендарная роўнасць на працоўным месцы».

— Палова менеджараў у нашай кампаніі — дзяўчаты з дзецьмі ці цяжарныя, а мужчыны — шматдзетныя бацькі. Многія працуюць сем'ямі. У нас гнуткі графік і магчымасць аддаленай работы. Многія працуюць дома, знаходзячыся ў дэкрэце, а ў кампаніі створаны ўмовы для часовага знаходжання дзетак, уключаючы аніматараў.

Калі пераключыцца з работы ў канкрэтнай кампаніі на больш звыклую рэальнасць, то статыстыка паказа, што ў нашай краіне не вельмі высокая гатоўнасць людзей абараняць свае правы на працы. Толькі 25—30 % нешта прадпрымалі, каб адстаяць свае інтарэсы.

— З гэтай колькасці толькі 5 % звяртаюцца да нас па дапамогу ў працоўнай тэматыцы, — заўважыла **Таццяна СТРЫЖЭЎСКАЯ, дырэктар «Цэнтра па прасоўванні правоў жанчын».** — Палова ўсіх зваротаў спрацоўвае на папярэджанне, бо жанчына адчувае, што яе хочуць звольніць ці проста выжываюць з калектыву.

Аднак ёсць і дакладныя прыклады дыскрымінацыі. Так, на месца адной з жанчын, якая выйшла з дэкрэту, узялі іншага спецыяліста. Другой прапанавалі выйсці на чвэрць стаўкі, бо «дзіця малое, толку будзе мала». Трэцюю (ваеннаслужачую) ставілі ў нарад. Чацвёртай (з дзіцем-інвалідам) адмовілі ў змяшчэнні працоўнага графіку. Пятая проста зразумела, што не спраўляецца пасля выхаду з дэкрэту, бо ніхто не дапамог ёй адаптавацца, але затое яе пазбавілі прэміі, і гэта таксама дыскрымінацыя.

Калі падчас прыёму на работу працадаўца цікавіцца вашым сямейным становішчам і колькасцю дзяцей, адкажыце сустрэчным пытаннем «З якой мэтай вы гэтым цікавіцеся?», раіць Таццяна Стрыжэўская. Бо гэтае пытанне не датычыцца прафесійных якасцяў і адказваць на яго не абавязкова. Праўда, пры гэтым жанчына рызыкуе адразу ўвайсці ў канфрантацыю з патэнцыйным кіраўніком.

З іншага боку, яго занепакоенасць таксама можна зразумець, бо калі спецыяліст будзе часта сыходзіць на бюлетэнь, іншым прыйдзецца працаваць за яго. Аднак сучасны наймальнік адстае ад рэальнасці, яму таксама трэба мяняцца і разумець, што ў дэкрэт ці на бальнічны можа пайсці любы з бацькоў, а не толькі маці. Да наймальніка неабходна прад'яўляць больш высокія патрабаванні. Хто застанецца працаваць, калі захавацца гендарная і ўзроставая дыскрымінацыя? Гадоў праз 20 пенсіянераў у нас будзе больш, чым працаздольных. Тады адзіным выйсцем стане працоўная міграцыя або стварэнне такіх эканамічных умоў, калі жанчына не будзе пакутаваць ад дэкрэтафобіі і зможа нармальна працаваць і гадаваць дзяцей.

**Ірына СІДАРОК.**

З наваселлем!

# ТУТ НАШ ДОМ

**Вялікая сям'я Васіля і Вольгі ВАРАБЕЙ з Калінкавічаў атрымала ключы ад новай маёмасці. Наваселле справілі ў дзіцячым доме сямейнага тыпу. Разам з трыма роднымі — Валянцінам, Дар'яй і Уладзімірам тут будуць жыць і трое прыёмных дзяцей: Максім, Дзіяна і Ірына Гарнастаевы. Дзякуючы бацькам-выхавальнікам, усе сталі блізкімі і роднымі.**

Шматдзетныя бацькі — Васіль і Вольга Варабей, якія ў шлюбе каля 10 гадоў, кажуць, што ўсё робяць разам. Гэтаму ж вучаць і сваіх дзяцей. У сям'і любяць працаваць на зямлі. Вольга з задавальненнем займаецца вышываннем, умее смачна гатаваць. Усе сябруюць са спортам і не сябруюць са шкоднымі звычкамі. Пра вялікую сям'ю марылі і мама, і тата, таму кожнаму з дзяцей удзяляецца дастаткова ўвагі.

Двухпавярховы катэдж плошчай больш за 250 кв. м змяшчае дзесяць пакояў. Таму асабістая прастора будзе ў кожнага. У доме ёсць усё неабходнае. У двары — дзіцячая пляцоўка, гараж і гаспадарчыя пабудовы.



Унёсак у адкрыццё дома сямейнага тыпу зрабілі многія прадпрыемствы і арганізацыі, прадстаўнікі якіх шчыра радаваліся за навасёлаў. Чырвоную стужку ганаровыя госці перарэзалі разам з малымі. Ад імя мясцовых улад намеснік старшыні Гомельскага аблвыканкама Уладзімір Прывалаў уручыў сям'і сертыфікат на дзве тысячы рублёў для набыцця мяккай мэблі.

Увогуле, дзіцячы дом сямейнага тыпу ўзводзіўся ў адпаведнасці з Дзяржаўнай інвестпраграмай. На яго будаўніцтва было накіравана Br225 тысяч з рэспубліканскага бюджэту і Br242 тысячы — з абласнога. За кошт бюджэтных сродкаў таксама ўкамплектавалі катэдж усім неабходным: ад посуду і бялізны да мэблі і сучаснай тэхнікі.

Цяпер у Гомельскай вобласці адкрыта 48 дамоў сямейнага тыпу, у якіх пражывае 311 дзяцей.

**Наталля КАПРЫЛЕНКА.**
**Фота Мікалая БАРЫСЕНКІ.**

(Не) мужчынская справа

# ПАЙШОЎ ТАТА Ў «АДПАЧЫНАК»...

## і вярнуўся іншым чалавекам

**Герой артыкула Аляксандр (імя зменена) прызнаўся, што час, праведзены ў дэкрэтным адпачынку, змяніў яго погляд на «традыцыйна жаночую» працу кардынальна. Шмат мужчын проста не заўважаюць яе і часта бачаць толькі вынікі клопату аб доме, дзіцяці ці ўвогуле ўяўляюць, што агеньчык ў «сямейным ачагу» гарыць сам па сабе. Тое, што цяпло гэтага агеньчыка падтрымліваць вельмі складана, многія мужчыны нават не здагадваюцца.**



Фота носіць ілюстрацыйны характар.

Калі мы сустрэліся з Аляксандрам, ён сказаў, што вельмі шчаслівы, бо ў яго добрая клапатлівая жонка, якая кожны дзень падтрымлівала яго намаганні, і цудоўная дачка, якая расце на яго вачах і радуе. Ён адчуў на сабе ўсе радасці «адпачынку па доглядзе за дзіцем», і таму ўпэўнены, што, каб зразумець жанчыну, мужчыне патрэбна хоць бы паўгода пабыць у такім водпуску.

Калі жонка Аляксандра нарадзіла, то менавіта яна і пайшла ў дэкрэтны водпуск. Жылі, як звычайная сям'я, якіх у Брэсце сотні, і ніхто з іх і падумаць не мог, што хутка ўсё зменіцца.

Праз паўгода пасля нараджэння дачкі Сонечкі жонцы Аляксандра патэлефанавалі знаёмыя, якім патрэбны быў работнік, і прапанавалі жанчыне заробак у два з паловай разы больш, чым быў у мужа.

— Спачатку мы разгубіліся,— успамінае Саша. — Але такі шанц упускаць не хацелася. Жонка тады ці то жартам, ці то ў сур'ёз спытала: маўляў, пойдзеш у дэкрэтны? А я адказаў: «Чаму не!». Потым, канешне, задні ход няёмка было даваць. Паабяцаў — трэба выконваць. Прызнацца, я ўвогуле тады не разумеў, на што падпісаўся.

### Лёгка не будзе

— Не хочацца ўспамінаць першыя дні, — гаворыць Аляксандр. — Калі разам з жонкай глядзіш за дзіцем у якасці «прынясі, падай, падыдзі», падаецца, што ўсе лёгка. Ну што там можа быць цяжкага? Наліў малачка ў бутэлечку, падагрэў, даў дзіцяці, памяняў памперс і ўсё — ідзі сваімі справамі займайся. Але на самай справе я проста быў не гатовы да такога аб'ему абавязкаў. Яшчэ пашанцавала, што гатаваць умею.

Так у першы дзень свайго «дэкрэтнага адпачынку» Саша вырашыў здзівіць жонку і прыгатаваць ёй вячэру. Яму здавалася, што такім чынам ён яе трошкі супакоіць, каб яна там, на працы, не хвалявалася за яго з дачкой.

— Памятаю, Сонечка плача, значыць, трэба яе пакарміць. Пачаў варыць кашу. І раптам да мяне даходзіць, што, магчыма, ёй лепей зараз памперс памяняць, можа, яна таму і плача. Кінуўся мяняць, успомніў пра бялізну, якую трэба закінуць у пральную машыну. Ну, думаю, можа пазней. Але ж я яшчэ і тое-сёе паставіў на пліту. Адчуваю — нешта падгарае. Бягу на кухню, каб выратаваць кашу і вячэру, малая лямантуе... Тут тэлефонны званок — цешча на тым канцы провада заклапочана пытаецца, як я спраўляюся... Не ведаю, як у такой сітуацыі можна застацца спакойным. Калі жонка прыйшла, яна ўбачыла разгубленага і стомленага мужчыну...

Саша ў той дзень усвядоміў, што лёгкага адпачынку не будзе. Ён вырашыў выпрацаваць для сябе нейкую сістэму, каб усё паспяваць і не расчараваць сваіх жанчын. На дасягненне мэты пайшло каля двух месяцаў. Прыкладна праз такі тэрмін мужчыну ўдалося зрабіць усё задуманае.

— Я ўжо на ўзроўні падсвядомасці адпрацаваў, дзе і што мне рабіць у пэўны момант. Напрыклад, бутэлька для малака стаіць на стальніцы і тут жа побач соска, адразу стаўлю кашу варыць, а ў халадзільніку на другой паліцы зверху стаіць малако... Я вывучыў, што і дзе ляжыць, зрабіў усе так, каб неабходнае было пад рукой, давёў усе свае дзеянні да аўтаматызму.

Паспаць нармальна атрымалася толькі ў першыя дні дэкрэту. Пасля прыходу жонкі з працы ён проста ўмомант засынаў ад стрэсу і стомленасці. Але хутка прыйшоў іншы стан. Калі быццам бы ты спіш, але пры гэтым адчуваеш нейкае напружанне.

— Нават калі засынаеш з дачкой днём, то немагчыма пагрузіцца ў сапраўдны расслаблены сон,— гаворыць Саша.— Любы шоргат ці піск — і ты ўскокваеш. Становішча страшна: а раптам Соня перавярнулася тварам у матрац?

**«Я ніколі не падазраваў, што жыццё дзяцей можа быць такім небяспечным. Адвярнуўся — малая ўпала, зазяваўся — стукнулася аб нешта».**

### Звычайнае незвычайнае жыццё

Пакуль тата прывыкаў да новай ролі ў сям'і, малая пачала поўзаць. Часу стала менш. Мужчыну прыходзілася ў прамым сэнсе не спускаць з яе вачэй. Адвярнуўся — провад у роце ці цісканне кнопак, спробы праглынуць усё, што трапляе пад руку. Але Сашу ўдалося выпрацаваць рэжым і яны з дачкой пачалі выходзіць на прагулкі, пакуль маці была на працы. Спачатку тата хацеў уліцца ў калектыў жанчын-дэкрэтніц. Нават зрабіў крок насустрач маладым мамам. Але жанчыны яго намаганні прынялі без энтузіязму.

Саша падумаў, што можа, яно і лепш. Таму што ўвагу ад дзіцяці не будуць адцягваць размовы. Падчас прагулкі ён проста хадзіў вакол дома. Калі ж малая пайшла ножкамі, то, вядома, маршрут памяняўся і знаходжанне на вуліцы перастала быць спакойным, як і ў доме ўвогуле.

— Я ніколі не падазраваў, што жыццё дзяцей можа быць такім небяспечным. Адвярнуўся — малая ўпала, зазяваўся — стукнулася аб нешта. Памятаю, панадзілася дачка вычэрпваць пальчыкамі мыльную ваду ў пральнай машыне, а потым аблізваць іх. Прыйшлося кожны раз пасля прання ўсё выціраць насуха. Ці звычайныя паперкі на падлозе... Кінула, ступіла ножкай і тут жа, як па лёдзе, паехала. Канешне, падала і раўла. Сачыў за гэтым пільна, каб ніводнай паперкі не валялася.

...Было шмат смешных і вясёлых момантаў. Аляксандр падрымліваў творчыя парывы сваёй дачкі. Аднойчы затрымаўся ў адным пакоі, але да пачуццяў яго вярнула цішыня ў кватэры. Кінуўся за малой на кухню. А яна малюе «мурал» на паўсцяны васкавымі крэйдамі. Соня так натхнёна і старанна працавала, што тата не рашыўся яе прыпыніць.

### Што ў выніку?

Цяпер малая пайшла ў дзіцячы садок. Мужчына ж упэўнены, што новы досвед зламаў шмат яго ўнутраных установак.

— Людзей уводзіць у зман мяккая фармулёка, — гаворыць Алясандр. — Ну што значыць «дэкрэтны адпачынак»? Які ж гэта адпачынак? Гэта цяжкая, штодзённая, аднатыпная праца. Жонка гэта разумела і давала мне магчымасць у суботу займацца сваімі справамі, каб псіхічна хапала сіл вытрымліваць нагрузку. Мне здаецца, што мужчына, які рашыцца пайсці хоць бы на паўгода ў дэкрэтны «адпачынак», ужо не зможа папракнуць сваю жонку, калі яна не паспела нешта зрабіць па гаспадарцы. Ён будзе берагчы яе і даваць магчымасць паспаць, адпачыць, будзе больш чуллівы і адказны. Жанчына ад прыроды ўмее ўтрымліваць у галаве шмат задач адначасова, не толькі ўтрымліваць, але і вырашаць іх так, каб у доме не згасаў сямейны ачаг. Думаю, гэта якасць уласціва жаночаму роду ўвогуле, і да іх таленту трэба ставіцца з вялікай павагай. Мужчыны таксама могуць гэтаму навучыцца, толькі трэба рашыцца на такі незвычайны «адпачынак».

Пытанне — адказ

# ФОРМА І ЗМЕСТ

***Якія формы сямейнага ўладкавання дзяцей, што засталіся без апекі бацькоў, існуюць у нашай краіне?***

**(Ірына Караневіч, *г. Гомель*)**

### УСЫНАЎЛЕННЕ

Усынаўленне лічыцца прыярытэтнай формай уладкавання дзіцяці-сіраты. Паміж усынавіцелем і ўсыноўленым узнікаюць такія ж правы і абавязкі, як паміж кроўнымі бацькамі і іх дзецьмі. Дзіця прымае прозвішча і імя па бацьку ўсынавіцеляў. Такое дзіця мае ўсе правы на спадчыну. Усынаўленне афармляецца праз суд. Пры гэтым розніца ва ўзросце паміж усынавіцелем і дзіцем павінна быць не менш за 16 і не больш за 45 гадоў.

Упраўленне адукацыі па месцы жыхарства на працягу першых трох гадоў пасля ўсынаўлення кантралюе ўмовы жыцця і выхавання дзіцяці ў сям'і.

### АПЕКА І ПАПЯЧЫЦЕЛЬСТВА

Апека — гэта прыняцце ў дом дзіцяці на правах выхаванца.

Апека ўстанаўліваецца над дзецьмі ва ўзросце да 14 гадоў, а папячыцельства — над непаўналетнімі ва ўзросце ад 14 да 18 гадоў. Пад апеку дзяцей часта бяруць сваякі, якія маюць пераважнае права перад іншымі асобамі. Апека афармляецца ў адміністрацыйным парадку. Дзіця пры гэтым не мяняе прозвішча, не лічыцца вашым і можа мець зносіны з былымі сваякамі. Органы апекі праводзяць кантрольныя абследаванні ўмоў жыцця апекуноў.

На дзіця выплачваецца штомесячная дапамога. Сумы, што атрымлівае падапечны ў якасці пенсій, дапамог, аліментаў і іншых бягучых паступленняў, накіроўваюцца ў распараджэнне апекуна або папячыцеля і выдаткоўваюцца ім на ўтрыманне гэтага падапечнага.

### ПРЫЁМНАЯ СЯМ'Я

Прыёмная сям'я — форма выхавання дзіцяці ў сям'і дома ў прыёмных бацькоў-выхавацеляў. Звычайна ў прыёмную сям'ю перадаюць дзяцей, якіх немагчыма перадаць на ўсынаўленне або пад апеку сваякам. Такая сям'я замяняе знаходжанне дзіцяці ў дзіцячым доме на хатняе выхаванне і ствараецца на аснове дагавора паміж прыёмнымі бацькамі і органамі апекі. Тэрмін змяшчэння дзіцяці ў такую сям'ю вызначаецца дагаворам і можа быць розны. На практыцы дагавор аб прыёмнай сям'і заключаецца да паўналецця дзіцяці.

У прыёмных сем'ях можа выхоўвацца ад аднаго да васьмі дзяцей, у тым ліку родных дзяцей. Прыёмным бацькам плаціцца заробак і залічваецца працоўны стаж. У адносінах да дзіцяці прыёмныя бацькі з'яўляюцца апекунамі. На дзіця выплачваецца штомесячная дапамога, даюцца льготы па транспартным абслугоўванні. Пасля таго як яму міне 18 гадоў, даецца жыллё, калі яго няма. Але органы апекі пастаянна кантралююць выхаванне і расходаванне сродкаў.

### ПАТРАНАТНАЕ ВЫХАВАННЕ

Яно падыходзіць тым, хто хоча паўдзельнічаць у жыцці дзіцяці, якое расце без сям'і, стаць сябрам малому, якое жыве ў дзіцячым доме або інтэрнаце. Патранатныя выхавацелі могуць наведваць дзіця ва ўстанове, забіраць яго да сябе на выхадныя дні і канікулы. Звычайна на гэтую форму выхавання могуць разлічваць падлеткі альбо малыя, якія маюць асаблівасці псіхафізічнага развіцця. Абавязкі патранатнага выхавання выконваюцца на бязвыплатнай аснове, пры гэтым апека, папячыцельства над такімі дзецьмі захоўваюцца за кіраўнікамі дзіцячых інтэрнатных устаноў. Кантроль за ўмовамі выхавання і ўтрымання такіх дзяцей ажыццяўляецца органамі апекі і папячыцельства.

**Матэрыялы падрыхтавала Наталля ТАЛІВІНСКАЯ.**

Сямейны доктар

## АКТЫЎНАСЦЬ У «ПАВАЖАНЫМ» УЗРОСЦЕ — ТОЛЬКІ НА КАРЫСЦЬ

*«Мама заўсёды вылучалася тым, што ёй падабаліся мужчыны. У маладосці ў яе было шмат раманаў. Але з узростам гэта не спынілася. Цяпер ёй 75 гадоў, яна даўно жыве адна. І дагэтуль перыядычна ў яе з'яўляюцца кавалеры. Яна вельмі актыўная, пастаянна ўдзельнічае ў мерапрыемствах для пажылых людзей, танцавальных вечарах "Для тых, каму за...", дзе і знаёміцца. У тым, што з яе фізічным здароўем усё ў парадку, сумненняў няма. А вось з псіхічным? Ці нармальная такая актыўнасць у такім паважаным узросце?»*

**Марыя, г. Мінск.**

Адказвае **ўрач-сексолаг Мінскага гарадскога клінічнага псіхіятрычнага дыспансера Вольга НЕЎДАХ.**

— Палавая актыўнасць у такім узросце пры адсутнасці іншай паталогіі (фізічнай ці псіхічнай) абсалютна нармальная з'ява. Іншая справа, што зусім не частая. Палавая актыўнасць залежыць ад нашай палавой канстытуцыі. А гэта сукупнасць біялагічных прыкмет, іншымі словамі, тое, што даецца нам ад нараджэння, як, напрыклад, колер вачэй, і на працягу жыцця застаецца нязменным.

Ёсць тры тыпы палавой канстытуцыі: слабая, сярэдняя і моцная. У залежнасці ад палавой канстытуцыі сексуальная актыўнасць таксама будзе рознай.

Для ацэнкі палавой канстытуцыі выкарыстоўваюць шкалу вектарнага вызначэння. Для мужчын яна распрацавана і апрабавана неўрапатолагам, адным з заснавальнікаў савецкай сексалогіі і сексапаталогіі Георгіем Васільчанкам, для жанчын — Ірынай Ботневай.

Па гэтай методыцы ў жанчын вызначаюць наступныя паказчыкі: менструальная функцыя (яе пачатак, а таксама характар — рэгулярная без паталогій ці з асаблівасцямі), дзетародная функцыя (тэрміны наступлення цяжарнасці і характар яе цячэння), трахантэрны індэкс (суадносіны росту і даўжыні нагі), характар аваласення (па мужчынскім ці жаночым тыпе), прабуджэнне эратычнага лібіда (у якім узросце), аргазм. Атрыманыя паказчыкі параўноўваюць з сярэднімі значэннямі нормы. Яны, дарэчы, дазваляюць меркаваць не толькі аб палавой канстытуцыі, але і аб характары яе парушэнняў.

Мяркуючы па звестках, што ёсць у пісьме, можна канстатаваць, што вашай маме пашчасціла, бо яе прыродныя даныя дазваляюць весці актыўнае паўнацэннае жыццё ў сталым узросце.

**Алена КРАВЕЦ.**

Пра «гэта»

# СІЛА ПРЫЦЯГНЕННЯ

## Чалавеку заўсёды патрэбен нехта іншы



**Рамантыка, закаханасць і тым больш секс — гэта толькі для маладых, здаровых і прывабных людзей. Пажылыя мужчыны, якія праяўляюць сексуальную зацікаўленасць, — вычварэнцы, небяспечныя для грамадства. А пажылыя жанчыны, якія захавалі цікавасць да сексу, — амаральныя. Як вам такія перакананні? Блізкія ці не вельмі?**

Ні для каго не сакрэт, што дарослыя дзеці часта адмоўна ставяцца да жадання сваіх узроставых бацькоў стварыць новую сям'ю, лічачы, што калі, напрыклад, пажылы мужчына сустракаецца з жанчынай, то яна, напэўна, хоча яго абабраць да ніткі. І што за іх адносінамі абавязкова нешта хаваецца: кватэра, спадчына альбо яшчэ штосьці. А для ўзроставай жанчыны ў нашым грамадстве прадугледжана толькі адна сацыяльная роля — бабулі, якая выхоўвае ўнукаў або корпаецца ў градках. Сама думка пра тое, што чалавек ва ўзросце можа мець жаданне заводзіць новыя знаёмствы, а тым больш (крый божа!) займацца сексам, выглядае для большасці людзей амаль блюзнерствам.

— Але калі вам падабалася чытаць дэтэктывы і есці шакаладнае марозіва ў маладосці, то цалкам верагодна, што і ў 60, і ў 70, і ў 80 гадоў вашы перавагі не зменяцца. Гэтак жа і сексуальнасць, у сталым узросце яе варта разглядаць у кантэксце асобы кожнага чалавека, — лічыць **псіхатэрапеўт-сексолаг, дактарант і даследчык сексуальнасці сталага веку Марына СЛАВІНСКАЯ**. Сваімі поглядамі на гэтую тэму эксперт падзялілася падчас форуму «Годнае даўгалецце», што праходзіў у Мінску.

Наогул, па ўяўленні маладых людзей і людзей сярэдняга ўзросту, патрэбы пажылых зводзяцца ў асноўным да рэчаў, якія датычацца, хутчэй, медыцыны. Сваякам людзей, якім «за 70», як правіла, і ў галаву не прыходзіць, што тым, акрамя ежы і лекаў, яшчэ штосьці трэба. А ім трэба! І цікавасць да жыцця ў многіх пажылых людзей таксама захоўваецца. Аўтар гэтых радкоў, напрыклад, ідучы са сваім 77-гадовым бацькам праз гарадскі сквер, пачула ад яго задуменную рэпліку: «Як жа спяваюць птушкі, цудоўна, цудоўна...» А яшчэ праз пару тыдняў, зайшоўшы ў яго кватэру, пасярод неверагоднага беспарадку, які ўтварыўся за той невялікі прамежак часу, пакуль да яго ніхто не прыязджаў, убачыла на століку каля ложка раскошны букет позніх восеньскіх кветак, які нібы сышоў з нацюрмортаў XVII стагоддзя. Бо не хлебам адзіным — і гэта датычыцца любога ўзросту.

Увогуле ж, вердыкт навукоўцаў такі: насуперак мноству міфаў пра ўплыў узросту на сексуальнасць псіхічная патрэба ў інтымнай блізкасці і душэўных перажываннях не праходзіць з гадамі, а фізіялагічныя працэсы старэння не блакуюць палавую функцыю. Сексолаг Марына Славінская падзялілася абуральным выпадкам, які, праўда, адбыўся не ў нас: у Ізраілі чацвярых жыхароў прэстыжнага і дарагога дома састарэлых «злавілі» падчас інтымнай блізкасці ў адным ложку. Большасці з іх было за 90, а «застукала» іх медсястра. Яна сумелася і выйшла з пакою, але на наступны дзень адміністрацыя выклікала гэтых пажылых людзей да сябе і нагадала ім аб правілах дадзенай установы, якія забараняюць заняткі сексам. Таксама адміністрацыя адправіла лісты іх дзецям аб неналежных паводзінах бацькоў. Некаторым дзецям было за 70 гадоў...

Растлумачу на ўсялякі выпадак: абуральнымі спецыяліст палічыла зусім не паводзіны пастаяльцаў дома састарэлых, а стаўленне да іх адміністрацыі. «Дык што ж такое сексуальнасць?» — задаецца пытаннем Марына Славінская. І адказвае: гэта энергія, якая падахвочвае чалавека шукаць каханне і адносіны, інтымнасць і блізкасць, і выяўляецца ў паводзінах і пачуццях. Яна існуе ў кожным чалавеку ад моманту яго нараджэння і да канца яго жыцця. І яна важная для псіхічнага і фізічнага здароўя чалавека ў любым узросце. Сексуальнасць дорыць нам пачуцці кахання, блізкасці, упэўненасці ў сабе і радасці.

***

Альфрэд Кінсі, амерыканскі біёлаг, сексолаг і сацыёлаг, правёў першыя даследванні пра сексуальнасць пажылых людзей. І адзначыў, што сапраўды з узростам назіраецца зніжэнне палавой актыўнасці, перш за ўсё звязанае з фізіялагічнымі зменамі. Але сексуальны інтарэс і жаданне з узростам не змяншаюцца. Так што секс пасля 60, 70 і нават 90 — гэта не выключная з'ява. Напрыклад, па дадзеных Манчэстарскага ўніверсітэта, больш за палову брытанскіх мужчын і каля траціны жанчын, старэйшых за 70 гадоў, сексуальна актыўныя. Аналагічнае даследаванне ў ЗША таксама паказала, што пажылыя амерыканцы не перастаюць займацца сексам. У Расіі з даследаваннямі сексуальнасці, асабліва людзей ва ўзросце, усё крыху больш складана, але, па словах сацыёлага Дзмітрыя Рагозіна, які праводзіў маштабнае апытанне пажылых расіян, у 70—74 гады інтымнае жыццё захоўваецца ў 16 % — гэта менш, чым у Еўропе і ЗША, але ўсё роўна немала. І, думаецца, у Беларусі лічбы не вельмі адрозніваюцца ад расійскіх. Так што з надыходам пенсійнага ўзросту зусім не абавязкова высакародна згасаць і рыхтавацца да смерці. Вядома, у сталым узросце сексуальнасць можа прымаць іншыя формы. Для пажылых людзей важныя дотыкі, абдымкі — для іх нярэдка гэта і ёсць сексуальнасць.

**Сваякам людзей, якім за 70—80 гадоў, як правіла, і ў галаву не прыходзіць, што тым, акрамя ежы і лекаў, яшчэ штосьці трэба. А ім трэба!**

І, дарэчы, нядаўна аўстралійскія даследчыкі высветлілі: немаладыя людзі, якія займаюцца сексам, у сярэднім валодаюць лепшай памяццю, чым тыя, чыё сексуальнае жыццё пасля 50 гадоў цалкам выключаецца з жыцця. Таксама навукоўцы кажуць, што сексуальна актыўныя пенсіянеры радзей пакутуюць ад старэчай дэменцыі. Вядома, у даследаваннях падобнага роду ёсць сур'ёзны недахоп — яны не дазваляюць выявіць, ці то секс прыносіць пажылым людзям такую карысць, ці то ён сам з'яўляецца следствам захаванага да старасці моцнага здароўя.

Вядома, можна сказаць, што ўсе гэтыя пытанні турбуюць у асноўным адносна невялікую праслойку забяспечаных старых дзесьці там, на Захадзе. А на постсавецкай прасторы, маўляў, надзённыя праблемы накшталт невялікай пенсіі і неабходнасці выкраіць з яе сродкі на аплату ежы, камуналкі, лекаў і падарункаў унукам, цалкам «паралізуюць» сексуальныя жаданні. Тым не менш і Марыну Славінскую, і іншых сексолагаў непакоіць галоўным чынам тое, што любыя праявы сексуальнасці і эратызму ў старэйшым узросце (а «старэйшым узростам» для сексу ў нас лічацца дзесьці 45—60 гадоў) пакрытыя «налётам» сораму. Папросту кажучы, людзям старэйшага ўзросту ў нашым грамадстве адмоўлена ў праве на падобныя рэчы.

Але што б ні дыктавала грамадская думка, з узростам пачуцці не прытупляюцца, і чалавеку заўсёды патрэбен іншы чалавек. А ў праблемы ўзроставай сексуальнасці, дарэчы, пік актуальнасці яшчэ наперадзе — у сувязі са старэннем насельніцтва нашай планеты. Людзі жывуць даўжэй, чым раней, сённяшнія старыя выглядаюць і адчуваюць сябе маладзейшымі, чым іх равеснікі мінулага пакалення. І да сярэдзіны гэтага стагоддзя пажылыя ўжо будуць складаць 20 працэнтаў ад усіх жыхароў планеты, а ў краінах, якія адносяцца да старэючых нацый (у Беларусі ў тым ліку), яшчэ больш.

**Святлана БУСЬКО.**

# «Часам дзеля будучыні дзяцей і трэба скасаваць шлюб»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «СГ».)*

***— Гэта значыць, развод для вас быў сюрпрызам?***

**Ганна:** — Развод быў маёй ініцыятывай. Муж, як гаворыцца, даў нагоду, а прычына — класічная: сівізна ў бараду — бес у рабрыну.

***— А колькі гадоў тады было дзецям?***

**Ганна:** — Уладзе 19, Стасу — 15.

***— Звычайна ў такіх сітуацыях жанчыны імкнуцца захаваць сям'ю, як кажуць, дзеля дзяцей...***

**Ганна:** — Спачатку я таксама думала: заплюшчу вочы, можа, тое захапленне мужа пройдзе... Але вельмі хутка зразумела, што часам менавіта дзеля будучыні дзяцей і трэба скасоўваць шлюб. Я не хацела, каб сын бачыў, што вось так можна паводзіць сябе ў адносінах да сям'і, не хацела, каб дачка бачыла, што жанчына можа многае трываць.

**«Жыццё з усімі яго складанасцямі цудоўнае і хуткабежнае, таму трэба радавацца кожнаму дню. Смех разгладжвае зморшчынкі. Таму я і пішу смешныя і вельмі аптымістычныя кнігі».**

***— Як дзеці паставіліся да вашага рашэння?***

**Ганна:** — Па-рознаму. Улада, мне здаецца, з нараджэння мудрае дзіця, яна мяне падтрымала. Стас больш хваравіта ўспрыняў маё рашэнне.

**Улада:** — Не ведаю, як маленькія дзеці, але падлеткі сапраўды адчуваюць, бачаць, разумеюць, што з бацькамі нешта не так. Гэта вельмі пакутліва, таму што ты любіш маму і тату — гэта самыя родныя і блізкія людзі. Міжволі думаеш, што ў іх сапсаваных адносінах ты таксама неяк вінаваты. Увогуле, гэта выпрабаванне для дзяцей, і ў некаторых сем'ях яно доўжыцца на працягу некалькіх гадоў. Таму я згодная з мамай: не трэба захоўваць тое, чаго ўжо няма.

***— А ў вас атрымалася мірна падзяліць маёмасць?***

**Ганна:** — Так, пра гэта мы змаглі дамовіцца. Але паколькі галоўным здабытчыкам у сям'і быў муж, то фінансавае становішча пагоршылася. Вядома, у мяне ёсць прафесія, але пасля замужжа «хадзіла» ў два дэкрэты запар. Потым выйшла на працу, але з-за маёй занятасці менш увагі даставалася дзецям, мужу, ён і прапанаваў пакінуць працу: маўляў, усім забяспечу. Уласна, кнігі я пачала пісаць пасля разводу з-за жадання зарабіць.

***— Дзеці і вы прывыклі да забяспечанага жыцця. Як яны ўспрынялі неабходнасць жыць сціпла? Часам у такіх сітуацыях дзеці хочуць кампенсаваць свае душэўныя раны нейкімі падарункамі, дарагімі рэчамі. Зноў жа, не хочацца выглядаць горш за аднагодак.***



Улада ў гасцях у мамы.



Улада АЛЬХОЎСКАЯ з узнагародай за сваю п'есу.

**Ганна:** — Мне ў гэтым сэнсе пашанцавала з дзецьмі. Яны разумелі і прымалі абставіны, якія склаліся, і «дай», «хачу» я ад іх не чула. Наадварот, яны самі стараліся зарабіць з юных гадоў. Я не падавала на аліменты, спадзяючыся на сумленне былога мужа.

**Улада:** — Магчыма, нам было лягчэй, таму што ў нас быў забяспечаны перыяд у жыцці. Бацькі заўсёды давалі мне і брату кішэнныя грошы, мы вучыліся імі распараджацца, таму да фінансаў стаўленне было досыць усвядомленае. Тата аплачваў маё навучанне ў Мінскім дзяржаўным лінгвістычным універсітэце. Я ўжо была паўналетняй, і ён сапраўды дапамагаў не па выканаўчым лісце, а па сумленні, за што я яму вельмі ўдзячная.

**«Трэба шчыра цікавіцца сваімі дзецьмі, размаўляць з імі, не ціснуць аўтарытэтам. Напэўна, проста любіць. Гэта так цудоўна, што я магу пра ўсё на свеце пагаварыць з мамай!»**

***— Ганна, пасля скасавання шлюбу жанчыны часам хочуць адпомсціць былому мужу. Хтосьці хутка знаходзіць новага — больш статуснага або багацейшага за папярэдняга, іншыя забараняюць мець зносіны з дзецьмі. Як вы перажывалі той перыяд?***

**Ганна:** — Гэта не мае метады. Наш развод — не падстава пазбаўляць дзяцей бацькі, тым больш што і ён не спыняў з імі зносіны. Шукаць новага мужа не было часу, ды і выбару практычна няма ў сваёй узроставай катэгорыі. Вядома, мне было няпроста, але ратавала пісьменніцтва. Гэта як курс бясплатнай псіхатэрапіі — раскладваеш усё па палічках, аналізуеш, разумееш прычыны, чаму так адбылося. А яшчэ гэта выдатная магчымасць напісаць кнігу аб тым, што «нашы перамаглі» і спраецыраваць яе на сваё жыццё. Адпомсціць, калі ўжо так хочацца, можна літаратурнаму герою, прататыпам якога з'яўляецца рэальны чалавек.

**Улада:** — Муж і жонка разышліся, а бацькі ў нас засталіся! І зараз у іх нармальныя адносіны, можна сказаць, сяброўскія.

***— А чым займаецца Стас?***

**Ганна:** — Моўшн-дызайнер. Ён да гэтага не адразу прыйшоў. Сын вучыўся ў матэматычнай гімназіі, займаў прызавыя месцы на банкаўскай алімпіядзе. Натуральна, сабраўся паступаць у эканамічны ўніверсітэт на банкаўскую справу. Літаральна ў першыя дні заняткаў ім сказалі: забудзьцеся пра трэйдынг, біржы, нічога гэтага ў нас няма, будзеце звычайнымі касірамі. Гэта яго расчаравала. Чым далей вучыўся, тым больш разумеў, што выкладчык не жартаваў. Пасля другога курса сказаў, што больш вучыцца не хоча. На сямейным савеце вырашылі, што дадзім яму год на пошук цікавай прафесіі. І ён па-добраму шукаў сябе, стараўся падпрацоўваць у гэты перыяд таксама. У выніку самастойна асвоіў прафесію моўшн-дызайнера. Цяпер у яго ёсць пастаянныя заказчыкі. Самае галоўнае, што яму падабаецца тое, што ён робіць.

***— Не кожны малады чалавек можа сказаць бацькам: усё, не хачу больш вучыцца.***

**Ганна:** — Удзячная сыну, што ён вызваліў ад марнавання грошай, бо яго навучанне аплачвала я. У мяне няма гэтай істэрыі: дзіцяці абавязкова трэба вышэйшая адукацыя. Дзіцяці патрэбна цікавая прафесія, добры заробак. Жыццё паказвае, што прасунутыя наймалькі глядзяць не на дыплом, а на тое, што ты ўмееш рабіць.

**«Я не хацела, каб сын бачыў, што вось так можна паводзіць сябе ў адносінах да сям'і, не хацела, каб дачка бачыла, што жанчына можа многае трываць».**

***— Ганна, вы ўжо гатовыя стаць бабуляй?***

